16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 45 (5254) 10 лістапада 2023 г.

ISSN 0024-4686

Вёрсты лясного паэта
стар. 6

Вечная нязгасная краса
стар. 12

Легенды жывуць недарма
стар. 13

Непаўторны сусвет класіка

Фота Віктара Іванчыкава.

«Калі пісьменнік глыбока адчувае сваю кроўную сувязь з народам, гэта дае прыгажосць і сілу яго творам і робіць іх вечнымі», — пісаў Максім Горкі. Нібы пра нашага класіка Якуба Коласа, дзень нараджэння якога адзначылі ў Беларусі на мінулым тыдні, сказаў яго рускі калега.

Святкаванні, як звычайна, прайшлі па ўсёй краіне, але асноўныя мерапрыемствы адбыліся ў мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю народнага паэта. Пачаліся ўрачыстасці 3 лістапада з ускладання кветак да помніка Якубу Коласу на сталічнай плошчы, якая носіць яго імя. А ў літаратурна-мемарыяльным музеі прайшла традыцыйная Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Каласавіны», якая прынесла нямала адкрыццяў і пазнаёміла з новымі цікавымі даследаваннямі ў галіне коласазнаўства. Сёлета яна была прымеркавана да 100-годдзя напісання паэмы «Новая зямля». З гэтай нагоды ў доме Коласа адбылося адкрыццё часовай экспазіцыі, прысвечанай легендарнаму твору і гісторыі яго выданняў. Куратарскую экскурсію па ёй правяла навуковы супрацоўнік музея Наталля Шувагіна-Адамовіч.

Прадоўжыліся ўрачыстасці 4 лістапада на Стаўбцоўшчыне. Госці святкавання ўсклалі кветкі да помніка Якубу Коласу ў раённым цэнтры, а пасля мелі магчымасць наведаць мемарыяльныя сядзібы «Акінчыцы», «Альбуць» і «Смольня» філіяла «Мікалаеўшчына».

«ЛіМ»-акцэнты

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў суайчыннікаў з Днём Кастрычніцкай рэвалюцыі. «Мінула больш як сто гадоў з моманту падзей Вялікага Кастрычніка, а яго ідэалы па-ранейшаму актуальныя і значныя. І сёння пераважная большасць насельніцтва Зямлі імкнецца да сацыяльнай справядлівасці, але многія краіны да гэтага часу сутыкаюцца з сучаснымі формамі эксплуатацыі і прыгнёту, культурнай экспансіяй, эканамічнымі санкцыямі і палітычным шантажом. Таму нам нельга забыць, што Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла новую старонку ў айчыннай гісторыі, паслужыўшы імпульсам для развіцця нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці. Пераадолеўшы ў нялёгкім дваццатым стагоддзі шматлікія выпрабаванні, раскрыўшы патэнцыял творчасці і стварэння, беларусы занялі дастойнае месца ў вялікай сям'і народаў свету», — гаворыцца ў віншаванні.

• Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народную артыстку Беларусі Зінаіду Зубкову з днём нараджэння. «Вы бліскуча рэалізавалі свой талент на легендарнай сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы і ўнеслі бясцэнны ўклад у развіццё беларускага мастацтва, — адзначыў Прэзідэнт. — Любоўю да Радзімы, гармоніяй і прыгажосцю напоўнена ўся ваша творчасць. Яе адметнай рысай была і застаецца вернасць найлепшым традыцыям айчыннай тэатральнай школы». Прэзідэнт выказаў упэўненасць у тым, што артыстка і ў далейшым будзе працаваць гэтак жа плённа і натхнёна, выхоўваць у гледачоў павагу да Айчыны.

Праект. Прэзентацыя факсімільнага выдання Жухавіцкага Евангелля XVI стагоддзя адбудзецца заўтра ў Мірскім замку, перадае БелТА. Культурны праект «Даследаванне і факсімільнае выданне помніка беларускага пісьменства — Жухавіцкага Евангелля XVI стагоддзя» з фондаў бібліятэкі імя Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук рэалізаваны ў рамках работы камісіі па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны абарот культурных каштоўнасцей. Ініцыятарам яго выступіў Замкавы комплекс «Мір». «Жухавіцкае Евангелле выйшла ў свет тыражом 99 экзэмпляраў з захаваннем асаблівасцей арыгінала, — расказаў дырэктар комплексу Аляксандр Лойка. — Арыгінал налічвае 347 старонак, факсімільная мініяцюра — 740. Пад яе вокладкай — вобразы чатырох евангелістаў. Выкананыя ў арыгінале кінавар'ю ініцыялы, застаўкі, загалоўкі перададзены з максімальным трапленнем у колер». Згодна з запісам, які захаваўся на адной са старонак рукапісу, у кастрычніку 1733 года Евангелле знаходзілася ў царкве вёскі Малыя Жухавічы, што пацвярджае яе беларускае паходжанне. Калі Жухавіцкае Евангелле аказалася ў Вільні, невядома.

Тэатр. Прэм'ера аперэты Жака Афенбаха «Прыгожая Алена» адбудзецца ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры сёння і заўтра. Аперэта лічыцца адной з самых папулярных пастановак у сваім жанры. За 150 гадоў існавання яе ставілі амаль усе музычныя тэатры свету. Дзеючыя асобы — багі і багіні старажытнагрэчаскіх міфаў. У аснову сюжэта аўтары паклалі міф аб выкраданні траянскім царэвічам Парысам Алены, жонкі спартанскага цара Менелая. «Жак Афенбах — родапачынальнік жанру аперэты, але ў нашым тэатры мы ставім яго ўпершыню. Менавіта спляценне камічнага складніка і опернага падыходу да вакалу, інструменталу і харэаграфіі прывялі да ўтварэння новага адгалінавання ў оперным жанры. Праца над гэтай пастаноўкай — сапраўды сур'ёзны крок для тэатра», — заўважыў галоўны дырыжор тэатра Юры Галяс. Рэжысёрам-пастаноўшчыкам аперэты выступіў Міхаіл Кавальчык, дырыжорам-пастаноўшчыкам стаў Юрый Галяс, балетмайстрам-пастаноўшчыкам — Алена Дзмітрыева-Лаўрыновіч.

Рэгіён. Выстаўка «Сям'я па духу: разам у царстве зямным і ў Царстве нябесным» працуе ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі. Экспазіцыя прысвечана 105-годдзю з дня трагічнай гібелі сям'і апошняга расійскага імператара Мікалая II і яго найбліжэйшага акружэння. Размова таксама аб тых, хто застаўся з імі да канца, і ў ноч на 17 ліпеня 1918 года прыняў пакутніцкую смерць. Так, у экспазіцыю ўвайшлі каля 50 сучасных кніг. Літаратура — з фондаў абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна, асабістай бібліятэкі архіепіскапа Віцебскага і Аршанскага Дзімітрыя і праваслаўнай бібліятэкі імя А. П. Сапунова пры Віцебскай духоўнай семінарыі. Таксама ёсць экзэмпляры з епархіяльнай бібліятэкі святой велікамучаніцы Кацярыны і бібліятэкі святой велікамучаніцы Ірыны з прадстаўніцтвам Беларускага экзархата пры Патрыяршым падвор'і ў Маскве. Больш як 30 экспанатаў Царкоўна-археалагічнага музея Віцебскай епархіі, якія таксама ўключае выстаўка, адносяцца пераважна да канца XIX — пачатку XX стагоддзя.

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Класікам — суботнік

У Пісьменніцкім парку каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прайшоў суботнік, арганізаваны Саюзам пісьменнікаў Беларусі.

Такога характару мерапрыемствы сталі добрай традыцыяй. Парк, заснаваны па ініцыятыве ганаровага старшыні СПБ, народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца, набірае сваю сілу. Дрэвы, пасаджаныя ў розныя гады ў гэтай утульнай мясціне, якую добра ведаюць гараджане і госці сталіцы, цягнуцца ўсё вышэй і вышэй. З мінулай восені, калі адзначалі 85-годдзе народнага пісьменніка Беларусі, аўтара дзясяткаў раманаў і аповесцей, літаратара, які амаль два дзесяцігоддзі ўзначальваў Саюз пісьменнікаў, было высаджана першае імянное дрэва — у гонар Мікалая Іванавіча Чаргінца. Сёлетняй вясной дадаўся дуб, пасаджаны ў звязку са 140-гадовым юбілеем класіка беларускай дзіцячай літаратуры Янкі Маўра.

Традыцыя працягваецца. І вось у лістападзе, у самы пярэдадзень Кастрычніцкага свята, пасаджаны дуб з імянной таблічкай, якая сведчыць, што гэтае дрэва заняло сваё месца ў парку і носіць імя народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі. Літаратары, якія прымалі ўдзел у суботніку, не маглі не згадаць неўміручыя панчанкаўскія радкі: «Бой пад вечар скончыўся, // А мы ўсё // Пра атаку, // Хоць былі ўжо «тыл». // І ніхто яшчэ з нас не памыўся, // І ніхто яшчэ з нас не астыў. // І ляжаць сябры ў магіле братняй — // У каманды пахавальнай многа спраў. // Не спяшыў камбат пісаць аб стратах, // Аб сваіх салдатах гараваў. // Кроіў хлеб мой друг рукою чорнай, // З гімнасцёркі не абмыўшы кроў. // Выпівалі па чатыры нормы — // Нашы // І загінуўшых сяброў». У суботніку ўдзельнічалі паэт Рагнед Малахоўскі, кіраўнік Цэнтра папулярызацыі літаратуры пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі празаік Анатоль Матвіенка, паэт і перакладчык Міхась Пазнякоў, галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» Аляксей Чарота, першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі дзіцячая пісьменніца Алена Стэльмах і шмат хто яшчэ. Многія з сённяшніх рупліўцаў добра ведалі народнага паэта, не аднойчы слухалі яго выступленні…

Шчырымі памагатымі пісьменнікаў у пасадцы дрэў выступілі працаўнікі УП «Мінскзелянбуда». А яшчэ ўдзел у суботніку прынялі прадстаўнікі башкірскай дыяспары, якія жывуць і працуюць у Беларусі. У прыгожых народных строях, з усмешкамі на тварах яны не выпадкова прыйшлі ў Пісьменніцкі парк. З 10 да 12 кастрычніка ў Мінску праходзілі Дні башкірскай літаратуры ў Беларусі. Прыехала да беларусаў вялікая пісьменніцкая дэлегацыя з Уфы. Яшчэ ў час перамоў пра прыезд башкірскіх сяброў у Беларусь ішла размова аб тым, каб пасадзіць дрэва ў гонар класіка башкірскай літаратуры Хадзіі Даўлетшынай. Яна ў 1936 годзе гасцявала ў Беларусі, прыняла ўдзел у Пленуме Саюза савецкіх пісьменнікаў, які быў прысвечаны беларускай і башкірскай паэзіі. Але ў кастрычніку па прычыне неспрыяльнага надвор'я не ўдалося высадзіць дрэва. І жаданне сваіх гасцей і сяброў беларускія калегі выканалі ў лістападзе, пасадзіўшы разам з прадстаўнікамі башкірскай дыяспары дрэва ў гонар Хадзіі Даўлетшынай… А ў 1936 г. у Мінску знаёміліся з беларускімі калегамі па літаратурным цэху больш як дзесяць башкірскіх паэтаў і празаікаў. З дакладам «Нараджэнне і шляхі башкірскай літаратуры» на пленуме выступіў старшыня Саюза пісьменнікаў Башкірскай АССР Афзал Тагіраў (1890 — 1938), які сваю літаратурную дзейнасць пачаў яшчэ ў 1907 годзе. Адзін з першых яго твораў — аповесць «Басякі», напісаная пад уплывам Максіма Горкага. У 1930-я гады А. Тагіраў напісаў тры раманы пра тое, як народныя масы ішлі ў рэвалюцыю, як усталёўвалі Савецкую ўладу. У 1937 годзе пісьменнік быў рэпрэсіраваны…

З просьбай пракаментаваць падзею мы звярнуліся да Алены Стэльмах:

— Парк набывае сваё адметнае аблічча. Мы штогод побач з ім праводзім фестываль дзіцячай літаратуры «У гасцях у Францыска Скарыны». І калі будзем збірацца наступны раз, а фестываль ладзіцца звычайна ў верасні, абавязкова прывядзём на экскурсію да памятных дрэў, высаджаных у гонар класікаў, хлопчыкаў і дзяўчынак, якія цікавяцца літаратурай, родным словам. Магчыма, з часам мы размесцім тут, у парку, інфакіёскі з QR-кодамі, праз якія можна будзе зайсці на розныя інфармацыйныя рэсурсы пра беларускую літаратуру. Мне здаецца, што сёння ўсе, хто нераўнадушна ставіцца да развіцця беларускай літаратуры, увогуле да літаратурнага выхавання моладзі, падлеткаў, разумеюць, што ў гэтай справе патрэбна быць разам, рабіць усё магчымае дзеля папулярызацыі і сучаснай мастацкай літаратуры, і багатай творчай спадчыны нашых папярэднікаў.

…Пакуль яшчэ на вуліцы рознымі краскамі радуе восень, але ўжо набліжаюцца халады, хутка выпадзе снег. Ды ўсё ж напярадзе — шчодрае вясенняе сонца, зялёная лістота і, канешне ж, новая, ужо вясенняя пара, якая, безумоўна, будзе спрыяльная і для пасадкі новых дрэў у Пісьменніцкім парку.

Кастусь ЛЕШНІЦА
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА

стасункі

І па-братэрску, і па-суседску

Пабачыў свет дадатак да альманаха «Літаратурная Гомельшчына» — зборнік прозы і паэзіі «Пад небам адзіным». Сваімі творчымі адкрыццямі дзеляцца пісьменнікі Гомельшчыны і Браншчыны.

Творы каля 70 літаратараў Беларусі і Расіі сабраны пад адной вокладкай. Падзею каментуе вядомы паэт і празаік — старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Гаўрыловіч:

— Далёка не ўпершыню беларускія і расійскія паэты і празаікі вядуць свой творчы рэй супольна. Наша аддзяленне на працягу многіх гадоў сябруе з творцамі Бранскай вобласці. Яны часта прыязджаюць да нас на літаратурныя святы. Мы ў сваю чаргу з вялікім задавальненнем прымаем іх запрашэнні. І вось — чарговы творчы праект. Гэтым разам мы паядналіся на старонках зборніка паэзіі і прозы «Пад небам адзіным». Кніга пабачыла свет у мазырскім выдавецтве «Калор». Яшчэ адно сведчанне, што кніжнае, літаратурна-мастацкае жыццё паўнакроўна развіваецца не толькі ў вялікіх гарадах. Зборнік — частка даўно, у 2007 годзе, заснаванай серыі «Літаратурная Гомельшчына».

Беларускую літаратуру ў кнізе «Пад небам адзіным» прадстаўляюць Алег Ананьеў, Ганна Атрошчанка, Міхась Болсун, Генадзь Говар і іншыя добра вядомыя літаратары.

Сяргей ШЫЧКО

анонсы

Купалаўскія чытанні

17 лістапада Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы правядзе навуковую канферэнцыю «Рэспубліканскія навуковыя чытанні». Акрамя пленарнага пасяджэння, якое адкрые прывітальным словам рэктар універсітэта кандыдат гістарычных навук, дацэнт Ірына Кітурка, работа канферэнцыі будзе праходзіць па тэматычных секцыях: «Агульныя праблемы купалазнаўства», «Актуальныя праблемы літаратуразнаўства», «Актуальныя праблемы мовазнаўства і дыдактыкі», «Актуальныя праблемы супастаўляльнага мовазнаўства», «Студэнцкая навука ў гонар Янкі Купалы».

У склад арганізацыйнага камітэта канферэнцыі ўвайшлі дасведчаныя навукоўцы не толькі з Гродзенскага ўніверсітэта, але і з Мінска і Брэста. У пленарным пасяджэнні, рабоце секцый прымуць удзел і члены Саюза пісьменнікаў Беларусі — старшыня секцыі крытыкі і літаратуразнаўства СПБ доктар філалагічных навук Валерый Максімовіч, кандыдат філалагічных навук Аліна Сабуць, краязнаўца з Карэліч Святлана Кошур, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ Дзмітрый Радзівончык і інш.

Даволі цікавымі падаюцца заяўленыя студэнтамі тэмы выступленняў, прысвечаныя беларускай літаратуры: «Семантыка-структурныя асаблівасці безэквівалентнай лексікі ў паэме "Новая зямля" Якуба Коласа (на прыкладзе субстантыва)» С. Міхаловіч, «Мадэль "восені" ў "жаночай" лірыцы Людмілы Кебіч» В. Рымко, «Мастацкі почырк Яўгеніі Янішчыц: слова літаратурнай крытыкі» Д. Шабельскай.

Мікола БЕРЛЕЖ

конкурсы

Вобразы скрозь стагоддзі

Заканчваецца прыём заявак на ўдзел у маладзёжным конкурсе творчых работ «Чысціня слова — чысціня душы». Ён ладзіцца па благаславенні Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, Брацтва ў гонар святога апостала Іаана Багаслова пры падтрымцы Сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы. Яшчэ адзін арганізатар — Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Арганізаваць такі конкурс стала магчыма дзякуючы інтэрнэт-тэхналогіям: у залежнасці ад таго, як імі распараджаюцца людзі, яны могуць несці карысць і дапамагаць у добрых справах. Напрыклад, прасоўваць і падтрымліваць айчынную літаратуру.

Для ўдзелу ў конкурсе трэба запісаць відэа з выкананнем паэтычнага твора ці фрагменту празаічнага, які мае прызнаную культурную і мастацкую каштоўнасць. Але і тыя, хто ствараюць самі, могуць паказаць сябе, запісаўшы творы ўласнага сачынення або эсэ на адну з прапанаваных тэм. Такім чынам і вызначаны пэўныя намінацыі — іх усяго пяць.

Варта пацікавіцца, якія тэмы прадугледжаны ў намінаці «Эсэ». Ёсць тэмы спецыфічна-гістарычныя: «Пуцяводная зорка беларусаў — Ефрасіння Полацкая», «Ефрасіння Полацкая: вобраз скрозь стагоддзі», «Кірыл Тураўскі — прапаведнік, пісьменнік, аратар». А ёць актуальна-патрыятычныя: «Доўг. Гонар. Айчына» і «Люблю цябе, зямля мая!». У гэтым цікавым праекце могуць браць удзел людзі ва ўзросце да 35 гадоў.

Адметна, што сярод мэт конкурсу — фарміраванне духоўнаморальных якасцей асобы і клопат пра развіццё творчага патэнцыялу моладзі, садзейнічанне культурнаму развіццю праз далучэнне да мастацкай літаратурнай творчасці і нават стварэнне ўмоў для выхавання творчай асобы з развітым эстэтычным густам. Але ёсць мэты і больш высокія: папулярызацыя і захаванне культурнай спадчыны беларускага народа і яго гісторыі, а таксама стварэнне творчай прасторы для зносін у сферы культуры і мастацтва.

Заяўку можна падаць да 12 лістапада. Конкурсныя работы — запісаныя відэа з выкананнем фрагментаў літаратурных твораў альбо эсэ — неабходна дасылаць на электронны адрас: *bratstvo.konkurs@gmail.com* (з тэмай ліста «КОНКУРС_2023»). У змесце электроннага ліста неабходна ўказаць кантактныя даныя ўдзельніка: прозвішча, імя, імя па бацьку, горад, нумар тэлефона і адрас электроннай пошты, а такама пазначыць, у якой намінацыі мяркуецца ўдзел кожнай работы.

Пераможцаў павінны вызначыць ужо да 19 лістапада. А вось узнагароджанне адбудзецца падчас Калядных чытанняў у Мінску.

Ларыса ЦІМОШЫК

Стымул — узнагарода

Напярэдадні чарговага пленума Саюза пісьменнікаў Беларусі ў зале Віцебскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя Максіма Горкага адбылося ўзнагароджанне пераможцаў, прызёраў і актыўных удзельнікаў конкурсу дзіцячых малюнкаў па кнігах пісьменнікаў Віцебшчыны «З кнігай свет дабрэйшы і лепшы».

Конкурс праведзены Віцебскім абласным аддзяленнем СПБ сумесна з дзіцячымі бібліятэкамі. Найлепшыя работы дэманстраваліся на адной з пляцовак XXX Дня беларускага пісьменства ў Гарадку, а напрыканцы кастрычніка заслужаныя ўзнагароды і памятныя прызы — дыпломы, прысмакі і кнігі Віцебскіх пісьменнікаў з аўтографамі — былі ўручаны пераможцам паэтамі Тамарай Красновай-Гусачэнкай, Мікалаем Намеснікавым, Валянцінай Шырынавай.

Свята суправаджалася дэманстрацыяй найлепшых малюнкаў, чытаннем вершаў і канцэртнымі нумарамі навучэнцаў СШ № 4 г. Віцебска аб Радзіме, сям'і і сяброўстве.

Старшыня абласнога аддзялення СПБ Тамара Краснова-Гусачэнка падкрэсліла: менавіта нязмушаныя сустрэчы з апорай на літаратурныя творы дазваляюць лёгка і даходліва фарміраваць разуменне аб ролі сям'і ў жыцці кожнага чалавека, аб традыцыях, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, аб каханні і павазе не толькі да старэйшых членаў сям'і, але і да малодшых.

Таццяна ТРУХАН

Мовай сэрца

Нядаўна ў раённым цэнтры культуры г. Валожына адбылася літаратурна-музычная вечарына «Мовай сэрца», прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння былога кіраўніка народнага літаратурна-мастацкага аб'яднання «Рунь», ганаровага члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Валянціны Францаўны Гіруць-Русакевіч. З успамінамі выступілі пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Віктар Шніп, Марыя Шакун, Аксана Мітрошчанкава, Наталля Жызнеўская, Зінаіда Гасціловіч і Тамара Бярэзіна. Цёплыя словы гучалі з вуснаў удзельнікаў «Руні», калег па працы, сяброваў-зямлячак і знаёмых. Запоўненая зала шчыра вітала выступленні гасцей, вершы-прысвячэнні Валянціне Гіруць-Русакевіч і песні на творы.

Пасля мерапрыемства калегі, родныя, блізкія і знаёмыя ўсклалі кветкі на магіле Валянціны Францаўны. Прагучалі словы памінальнай малітвы.

Прэс-служба МАА СПБ

паслясловe

Традыцыі «Каласавін» аб'ядноўваюць

XXXVII Міжнародная навуковая канферэнцыя «Каласавіны» была прысвечана 100-годдзю паэмы «Новая зямля». У ёй прынялі ўдзел даследчыкі творчасці, педагагічнай і навуковай дзейнасці Якуба Коласа з Беларусі і Расіі.

Дырэктар музея Ірына Мацяс згадала пра мерапрыемствы, якія былі прысвечаны 140-годдзю з дня нараджэння Я. Коласа, факсімільнае выданне «Новай зямлі», шматлікія выстаўкі і прэзентацыі.

Лідзія Слюсарэнка, вучоны сакратар Дзяржаўнага музея-запаведніка імя М. Шолахава, прасачыла агульныя рысы і пралелі ў творчасці Міхаіла Шолахава і Якуба Коласа, якія ўздымалі тэму адносін чалавека да зямлі.

Жанна Верыч з Пінкавічаў прадставіла ўспаміны першых вучняў Міхася Канстанцінавіча Міцкевіча. У Пінкавічах захоўваецца адно з брэндавых свят — «Жывыя старонкі "Новай зямлі"».

Дацэнт Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта паэтаэса Алена Ігнацюк аналізавала педагагічную дзейнасць Якуба Коласа.

Загадчык Віцебскага абласнога філіяла «Мастацкі музей» Аляксандр Базылёнак расказаў пра адзін з першых партрэтаў Якуба Коласа пэндзля віцебскага мастака Адама Бразера, і перадаў копію партрэта ў дар музею ў Мінску.

Пра ілюстратараў 20 розных выданняў паэмы «Новая зямля», мастакоў і кніжных графікаў — У. Сулкоўскага, Р. Клікушына і іншых распавяла загадчык навукова-асветніцкага аддзела музея Вольга Наважылава.

Марыя Міцкевіч падзялілася ўспамінамі пра польскага перакладчыка паэмы «Новая зямля» Чэслава Сенюха.

Фота Кастуся Дробава.

Падчас канферэнцыі.

Рэлігійныя і духоўныя аспекты творчасці і рысы асобы Якуба Коласа абмяркоўвалі магістр педагагічных навук Валерыя Філіпенка і катэхізатар храма св. Сафіі Слуцкай Юлія Чырва.

Даследчык гісторыі літаратуры Сяргей Шапран закрануў гумарыстычныя старонкі з жыцця любімага беларускага класіка.

Васіліна Міцкевіч падвяла вынікі канферэнцыі, адзначаючы вялікую цікавасць да літаратурнай спадчыны народнага песняра і глыбіню яго таленту.

Перад гасцямі і ўдзельнікамі канферэнцыі выступіў народны літаратурны тэатр «Жывое слова» БДПУ імя Танка.

Эла ДЗВІНСКАЯ

«ЛіМ»-люстэрка

Беларускія СМІ прынялі ўдзел у II Медыяфоруме краін СНД у Маскве. Такая інфармацыя змешчана на сайце Міністэрства інфармацыі Беларусі. Адзначаецца, што мерапрыемства сабрала больш за 300 прафесіяналаў з дзяржаў — членаў Садружнасці. Тэма пленарнага пасяджэння — «Будучыня міжнароднай журналістыкі». Між тым панэльныя сесіі былі прысвечаны выкарыстанню штучнага інтэлекту ў медыясферы, эфектыўным стратэгіям вядзення Telegram-каналаў, а таксама спецыфіцы падрыхтоўкі студэнтаў профільных факультэтаў у лічбавую эпоху.

Канцэрт лаўрэатаў аднаго з самых прэстыжных конкурсаў свету — Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага — упершыню пройдзе ў Вялікім тэатры Беларусі 8 снежня. Да 24-й гадавіны стварэння Саюзнай дзяржавы выступяць лаўрэаты XVII Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага. Як удакладняе БелТА, уладальніцай бронзавага медаля сёлета стала маладая беларуская спявачка Альбіна Тонкіх (сапрана). У канцэрце прымуць удзел лаўрэат III прэміі Леў Жураўскі (кларнет), лаўрэат III прэміі Ілья Папаян (фартэпіяна), лаўрэат II прэміі Ганна Камарова (флейта), лаўрэат II прэміі Равіль Ісламаў (скрыпка) і іншыя. Выступіць і сімфанічны аркестр Вялікага тэатра Беларусі. У якасці спецыяльнага госця запрошаны народны артыст Расійскай Федэрацыі Сяргей Ралдугін — адзін з найбольш вядомых расійскіх віяланчэлістаў.

Заяўку на ўдзел у кінафестывалі «Лістапад» падалі 10 дзяржаў СНД, інфармуе БелТА. «Выканкам СНД традыцыйна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы і правядзенні гэтага форуму, — расказаў генеральны сакратар СНД Сяргей Лебедзеў. — Мы заснавалі нават свой прыз, які ўручаем штогод па выніках фестывалю. Гэты форум сапраўды стаў добрай пляцоўкай для сустрэчы артыстаў, рэжысёраў, сцэнарыстаў, занятых у кінамастацтве, ён адлюстроўвае прагрэсіўныя павевы ў мастацтве. Тут прапагандуецца і прадстаўляецца мастацтва, блізкае да людзей, да жыцця. Менавіта таму гэты фестываль карыстаецца папулярнасцю, знаходзіць водгук у сэрцах і ўдзельнікаў, і кінагледачоў».

Дні культуры Расіі ў Беларусі прайшлі ў Брэсце, перадае БелТА. У рамках акцыі міністэрствы культуры дзвюх краін правялі сумеснае пасяджэнне калегій у Брэсцкім аблвыканкаме пад кіраўніцтвам міністра культуры Беларусі Анатоля Маркевіча і яго расійскай калегі Вольгі Любімавай пры ўдзеле Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Дзмітрыя Мезенцава. Сярод пытанняў, якія абмеркавалаі, — выкананне планаў па супрацоўніцтве паміж міністэрствамі на 2022—2024 гады і перспектыўныя напрамкі ўзаемадзеяння. Удзельнікі звярнулі ўвагу на рэалізацыю сумесных праектаў — фестываляў, выставак, абменных гастроляў тэатраў і канцэртных арганізацый і асобна — гастролі маладзёжнага расійска-беларускага сімфанічнага аркестра. У цэнтры ўвагі членаў калегій былі актывізацыя супрацоўніцтва ў сферы кінематаграфіі і стварэнне лічбавай бібліятэкі Саюзнай дзяржавы.

У Нацыянальным мастацкім музеі працуе выстаўка па выніках VIII Міжнароднага мастацкага пленэру «Святасць зямлі Беларускай», прысвечанага 850-годдзю скону прападобнай Ефрасінні Полацкай, а таксама Году міру і стваральнай працы. Арганізатарамі пленэру сталі Беларуская праваслаўная царква, Беларускі саюз мастакоў, Беларускі саюз жанчын, Беларускі саюз журналістаў, БелінжынірынгбудІнвест. У праекце прынялі ўдзел мастакі з Беларусі, Расіі і Малдовы. Сярод аўтараў — Глеб Отчык, Анатоль Отчык, Галіна Конанава, Аксана Еўдакіменка, Юрый Язан, Ганна Садоўская, Марта Шчэрбіч і іншыя. На выстаўцы па выніках пленэру прадстаўлена каля 50 твораў; частка прысвечана жыццёваму шляху Ефрасінні Полацкай. Таксама дэманструецца 30 работ пераможцаў рэспубліканскага конкурсу дзіцячага малюнка, праведзенага ў рамках пленэру. Убачыць экспазіцыю можна да 3 снежня.

Ганкураўская прэмія за 2023 год прысуджана Жан-Батысту Андрэа. Пісьменнік атрымаў найвышэйшую літаратурную ўзнагароду Францыі за раман «Стаўцеся да яе ўважліва», выпушчаны ў 2023 годзе. Як удакладняе «ИТАР-ТАСС», твор паказвае гісторыю кахання ў Італіі ў часы фашызму паміж выхадцамі з розных сацыяльных пластоў, якіх аб'яднала любоў да мастацтва. Такім чынам Жан-Батыст Андрэа ў сваёй творчасці захоўвае вернасць гуманістычным традыцыям французскай літаратуры. Нагадаем, Ганкураўская прэмія прысуджаецца штогод з 1903 года. Усе 10 членаў Ганкураўскай акадэміі, якія выбіраюцца пажыццёва, працуюць на грамадскіх пачатках і не атрымліваюць кампенсацыі за штогадовае прачытанне прыкладна 300 раманаў і адбор намінантаў.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Падзяка за «Міхасёвы прыгоды»

Кастрычнік 1935 года. Толькі што створаны Саюз савецкіх пісьменнікаў СССР. Якуб Колас з 1926 года — народны паэт Беларускай ССР. З 1928-га — акадэмік АН Беларускай ССР. З 1929 года — віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР. Колас — ужо аўтар «Новай зямлі», «Сымона-музыкі», «палескіх аповесцей», многіх іншых твораў, якія захапілі ўвагу беларускага, і не толькі, чытача. У 1934 годзе пісьменнік выдае аповесць «Дрыгва», прысвечаную легендарнаму Дзеду Талашу — удзельніку Грамадзянскай вайны, народнаму мсціўцу, барацьбіту з белапалякамі…

І вось у 1935 годзе ў Коласа нараджаецца паэма «Міхасёвы прыгоды»… «Налучыла зімою Міхася бяда: // Захапіла Міхася хвароб чарада. // Прыстала ангіна, // А потым адзёр. // Чуць-чуць з дыфтэрыту // Міхась не памёр. // Забіла дыханне, // І горла, і нос. // Ой, колькі пакуты // Міхась перанёс! // Ды ўсё ж далі рады // Яму дактары. // Вакцыну ўлівалі разоў тры. // Каб не вакцына, // Памёр бы хлапчына. // <…> // Доктар дзіцячы // Лячэнне прызначыў — // Адправіць Міхася на вёску. // Паветрам гаючым // І сонцам бліскучым // Міхасевы сілы ўзмацніць. // На ўлонні прыроды // Такія прыгоды, // Што ў горадзе нельга й сасніць. // Аб гэтых прыгодах якраз // І павядзецца тут сказ».

У 1934 годзе паэма «Міхасёвы прыгоды» друкуецца ў часопісе «Іскры Ільіча» у першым — шостым нумарах. Асобнае выданне да чытача прыйдзе не адразу… Толькі ў 1937 годзе. І вось у 1935 г. народны паэт Беларусі адважваецца і дасылае тэкст твора, якому будзе наканавана доўгае жыццё, славутаму савецкаму дзіцячаму пісьменніку Самуілу Маршаку, які на той час жыў яшчэ ў Ленінградзе. Самуіл Якаўлевіч нарадзіўся ў 1887 годзе, на пяць гадоў пазней за Якуба Коласа… У раннім дзяцінстве недзе з паўгода жыў у Віцебску, у бацькоў сваёй маці — Яўгеніі Барысаўны Гітэльсон. А бацька Самуіла — Якаў Міронавіч Маршак — дарэчы, з беларускага Койданава (Дзяржынска). У Ленінградзе пісьменнік арганізаваў дзіцячы альманах «Воробей», дзе друкаваліся Барыс Жыткоў, Віталій Біянкі, Яўген Шварц, іншыя добра вядомыя дзіцячыя пісьменнікі. На Першым з'ездзе савецкіх пісьменнікаў (у 1934 годзе) менавіта С. Маршак зрабіў даклад па дзіцячай літаратуры. І гэта была ініцыятыва Максіма Горкага, каб следам за ім з грунтоўным дакладам па дзіцячай літаратуры выступіў менавіта Маршак. Таму цалкам зразумела, чаму Колас менавіта яму адпраўляе рукапіс сваёй новай паэмы…

Самуіл Маршак.

Ліст С. Маршака ад 5 кастрычніка 1935 года:

«Дарагі тав. Колас,

Ад усёй душы дзякую Вам за дасыл мне Вашай выдатнай кнігі для дзяцей «Міхасёвы прыгоды». Віншую тых дзяцей, якім патрапіць у рукі гэтая кніга, напісаная вялікім майстрам і сапраўдным паэтам.

Упэўнены, што і іншыя паэты Беларусі ды і ўсяго Савецкага Саюза пойдуць следам за Вашым прыкладам і ўзбагацяць нашу дзіцячую літаратуру новымі вершамі і песнямі.

Моцна цісну Вашу руку.

С. Маршак».

У карэспандэнцыі ад ужо прызнанага класікам творцы няма ніякіх парад, няма крытычнага разбору. А мо яшчэ Якуб Колас чакаў, што асабіста Самуіл Якаўлевіч пагодзіцца выступіць перакладчыкам твора на рускую мову?.. І ўсё ж ліст гэты па свойму быў, відавочна, важны для Коласа ў той час. Ды цяпер ён бачыцца не толькі знакам ветлівасці, а старонкай добрай памяці ў стасунках беларускіх пісьменнікаў з іх расійскімі паплечнікамі па савецкай літаратуры.

Кастусь ЛЕШНІЦА

Да пытання пра назву «Новай зямлі»

У 1911 г., адразу пасля выхаду на волю, Якуб Колас у лісце свайму таварышу-выдаўцу Антону Грыневічу пісаў:

«Мілы пане Грыневіч!

Цяпер пасылаю гэты расказ. Пачытайце. Гэта — толькі частка вялікага расказа «Новая зямля». Але як ён мае сваё збольшага скончанае аблічча, то я Вам і пасылаю».

Тут і ў іншых крыніцах Коласава аўтарства паэма, дакладней, тады яшчэ «расказ» названы аўтарам так, як і засталося ў выніку. Са шматлікіх дакументальных матэрыялаў відаць, што і ў працэсе напісання твора паэт прытрымліваўся менавіта гэтай назвы (гл., напрыклад, ліст канца 1922 г., калі праца над паэмай падыходзіла да завяршэння).

Насамрэч Якуб Колас даволі доўгі час меў некаторыя сумненні адносна назвы. Як варыянт на заднім плане фігуравала прасцейшая фармулёўка — «Зямля». Трэба сказаць, што ў мастацкай літаратуры еўрапейскіх народаў выкарыстанне гэтага паняцця адносна твораў тоеснай праблематыкі на мяжы XIX і XX стст. было пашыраным (канечне, у сілу значэння зямлі для жыцця людзей — галоўным чынам сялян). Назавём, дзеля прыкладу, такія эпічныя творы ў прозе, як:

раман французскага класіка Эміля Заля (1840—1902), які быў цалкам апублікаваны ў 1887 г.;

аповесць украінскай пісьменніцы Вольгі Кабылянскай (1863—1942), што ўбачыла свет у 1902 г.;

раман амерыканскай пісьменніцы Перл Бак (1892—1973) пра жыццё кітайцаў (1931);

урэшце раман Кузьмы Чорнага (1900—1944), напісаны ў 1928 г.

Сюды прымыкае раман-эпапея паўднёвакарэйскай пісьменніцы Пак Кённі (1926—2008). Хаця часава твор крыху адстае (публікаваўся ад 1969 да 1994 г.). Падзеі ў творы ахоплены з 1897 па 1945 г. — перыяд вастрэйшых сацыяльна-палітычных пературбацый у Карэі. Што збліжае раман усходняй пісьменніцы з аналагічнымі творамі аўтараў Захаду.

Гэта толькі творы пад аднаслоўнаю назваю «Зямля». З выкарыстаннем у тытуле гэтага слова ў розных варыяцыях і спалучэннях знайшлося б яшчэ шмат розных твораў. (У сувязі з гэтым звернем увагу на слушнасць меркавання Алеся Адамовіча пра тое, што Коласава паэма стала прадвеснікам вялікіх эпічных твораў у беларускай літаратуры: «Новая зямля» сапраўды відавочна ўтрымлівае вялікую долю эпічнасці, што яе збліжае, тыпізуе ў тым ліку з замежнымі празаічнымі аналагамі, якія маюць сімвалічныя супадзенні ў назве.)

Для нашага выпадку нельга не прыгадаць яшчэ адзін твор — нямецкамоўны раман-утопію аўстравенгерскага пісьменніка яўрэйскага паходжання Тэадора Герцля «*Altneuland*» («Старая новая зямля», 1902). З Коласавай паэмай яны збліжаюцца не толькі назвамі — абодва творы сталі важнымі цаглінамі ў станаўленні нацыянальных дамоў. Больш таго, у абодвух творах можна адшукаць ідэйныя кропкі судакранання. Хаця яны напісаны ў зусім розных мастацкіх фарматах. Т. Герцль праз фантазіі, заснаваныя, аднак, на рэаліях і тэндэнцыях развіцця свайго часу, уявіў будучую дзяржаву свайго народа на палесцінскай зямлі (прычым нямала з яго мар сапраўды збылося, але аўтар пра гэта не даведаўся, бо памёр праз два гады пасля выхаду свайго твора). Твор атрымаўся фармальна празаічным і эпічным. З лірычнага ў ім — іманентнасць аўтарскага духу, рэалізаваная і адчувальная ў тэксце. У Якуба Коласа наадварот — будучыня роднай зямлі і супляменнікаў увасоблена ў вершаваным творы і пры ўсёй перавазе нібыта рэалістычнага наратыву лірычнасць праглядаецца праз тоўшчу алегарычнага сэнсу паэмы. Такім чынам, і раман яўрэйскага пісьменніка, і паэма беларускага маюць аднолькавы пасыл, на аснове якога збліжаюцца і тытулы твораў. Сімвалічным з'яўляецца год — 1923-і — у выпадку першага — калі адбываюцца асноўныя (утапічнага плану) падзеі, у выпадку другога — завяршэння і выхаду твора. Яшчэ адным неверагодным супадзеннем (?) з'яўляецца аднайменнасць Коласава псеўданіма — Якуб / Якаў — і старазапаветнага родапачынальніка яўрэйскага народа. (Думаецца, кампаратывісцкае даследаванне тут чакае свайго літаратуразнаўца.)

Фота Кастуся Дробава.

У выпадку з творам Якуба Коласа канчаткова ваганні адносна назвы развеяліся адно з завяршэннем паэмы. Пра гэта аўтар паведамляе сваёй жонцы літаральна ў той самы дзень: «Сегодня же закончил я "Новую зямлю". Конец меня удовлетворяет в полной мере. Несколько штрихов — и "Новая зямля" вполне оправдывает свое название и избавляет меня от надоедливой мысли, что содержание не соответствовало своему имени». Што праўда, як вынікае з кантэксту ліста, не столькі праблема назвы турбавала аўтара, колькі адпаведнасць зместавага напаўнення тытулу.

Тым не менш якая ж прынцыповая розніца паміж назвамі «Зямля» і канчатковай? Да таго ж у святле так званай энцыклапедычнасці — рысы, якая стала штампам для характарыстыкі твора. Аказваецца, існуе тая розніца на канцэптуальным узроўні. Для гэтага мастацкага твора як «энцыклапедыі» / «расказа» і нават рамана сапраўды дастаткова было б самага галоўнага, цэнтральнага канцэпта — зямлі. Аднак выхад за межы «расказа» на жанравы ўзровень паэмы запатрабаваў і адпаведнасці ў назве: праз даданне ўдакладняльная азначэння статычная «зямля» і захоўвала сябе як такую, і адкрывала перспектывы ідэйна-мастацкага плану. Канчатковая назва адлюстроўвае магчымасць прачытання ў творы не толькі тэксту самога па сабе, але і падтэксту, і кантэксту, і звыштэксту — таго «матыву ўнутранага імкнення селяніна вырвацца з межаў роднай хаты да высокіх спраў і інтарэсаў вялікага свету» (В. Каваленка), які меў месца не толькі ў беларускіх, але наогул у славянскіх літаратурах пачатку XX ст. Вельмі трапная для нашага выпадку фармулёўка знаходзіцца ў амерыканскага даследчыка літаратуры Эндру Брэдлі: «…Будзем лічыць сюжэтамі тое, што мы маем на ўвазе, калі, гледзячы на загаловак яшчэ не прачытанай паэмы, мы кажам, што аўтар выбраў той, а не іншы сюжэт». І назва, і жанр Коласавай *паэмы*, і яе сюжэт узаемаабумоўліваюцца: сапраўды, аўтар скіроўвае такім чынам чытача да ўспрымання не літаральнага пошуку зямлі героямі, але новага жыцця ў цэлым.

Што тычыцца самай распаўсюджанай інтэрпрэтацыі паэмы, варта зазначыць: «энцыклапедычнасць» «Новай зямлі» адносіцца да старога ладу — і гаспадаранне, і народнага жыцця, таму ўяўляе сабой, вобразна кажучы, якраз не «новую», але «старую» зямлю — папярэдні, дагістарычны жыццёвы парадак існавання беларускай сялянскай масы. У назву — «Новая зямля» — укладзена сімвалічнасць будучыні: у справе сацыяльна-эканамічнай фармацыі — капіталізму ці сацыялізму, у аспекце палітычнага самаўсведамлення мас — пераход ад этнічнага ўзроўню да нацыянальнага.

Дарэчы будзе прымяніць для тлумачэння вынікі стварэння Коласава твора вобраз, якім рэзюмуецца верш Андрэя Вазнясенскага «Вступление»: «По наитию // Дуешь к берегу, // Ищешь Индию — // Найдешь Америку!» Сапраўды, паэт сваю «Новую зямлю» пісаў не толькі і не столькі розумам, колькі сэрцам. Яно не падманула.

Анатоль ТРАФІМЧЫК

Анатоль ЗЭКАЎ:

«Радзіма не можа быць малой — яна заўсёды вялікая»

Адкрыты, добразычлівы, усмешлівы, з пачуццём гумару, заўсёды на аптымістычнай ноце — такі Анатоль Зэкаў, паэт, празаік, дзіцячы пісьменнік, сатырык-гумарыст, аўтар шматлікіх разнажанравых твораў, кніг і зборнікаў. Размову з ім хочацца доўжыць, бо ад слоў яго быццам саграваешся, а ўнутраная пяшчота бадзёрыць, зараджае. Так і чытачам хораша разам з чуллівым пісьменнікам, які дорыць святло мудрасці і натхненне. А як ён сталеў і выспяваў? Ад каго ў спадчыну атрымаў талент? Сам лічыць, што лірыка ў яго ад маці, а гумар — ад бацькі. А добразычлівасць — ад Бога? Даведаецеся з нашай гутаркі.

Фота Кастуся Дробава.

Мудрасць — з вёскі

— Анатоль Мікалаевіч, што значыць для пісьменніка радзіма?

— Можна пісаць вершы філасофскія, пра каханне, прыроду, але гэта зробіць любы. А тое, што я напішу пра сваю вёску, пра свой раён, — зраблю толькі я ці той, хто тут нарадзіўся. Лічу, што гэта мой абавязак — пакінуць землякоў у гісторыі з дапамогай вершаў, слова. Вясковыя бытавыя карцінкі — таксама спосаб. У нас сельсавет вялікі. Мая родная вёска Патапаўка велізарная: адна вуліца цэнтральная — 7 км, цягнік два разы спыняецца. Унук некалі запытаў: «Дзед, а ў Буда-Кашалёве цягнік колькі разоў спыняецца?» —«Адзін». — «А ў нашай Патапаўцы два разы. Дык чаму райцэнтр у Буда-Кашалёве?» Многія пераязджаюць сюды, бо тут чыгунка. Раней у нас на вуліцы было два статкі, а цяпер на ўсю вёску каровы чатыры. Новая рэальнасць...

У мяне шмат вершаў і пра вёску, і пра землякоў з іх мянушкамі — хачу, каб засталіся ў памяці. Сусед меў мянушку Буслік. Калісьці я напісаў пра яго апавяданне «Самагонная арыфметыка». Але імя, канешне, суседу даў другое. А ён потым, калі заходзіў, казаў: «Бяры тятрадь, я табе столькі гісторый нарасказваю». — «Расказвайце, я запомню». — «Я табе ўжо той раз расказваў, дзе? Не запомніў? Дык запісвай, я буду дыктаваць». Потым сын яго пазней спытаў мяне, ці буду я перавыдаваць апавяданне, і папрасіў: «Пастаў бацькава імя сапраўднае: хай унукі ды праўнукі ведаюць, што гэта іх дзед, прадзед».

Я не ўспрымаю словазлучэнне «малая радзіма». Радзіма не можа быць малой — яна заўсёды вялікая: і той куточак, дзе нарадзіўся, і тая краіна, дзе жывеш. Чым больш вялікая тая, адкуль ты выйшаў: дзе твае сябры, родзічы, дзе твой лес, рэчка, сцежкі-дарогі, па якіх бегаў у маленстве. Вялікія снягі былі ў нашу бытнасць — раніцай з хаты не выйсці. Цяпер разумееце, чаму ўваходныя дзверы адчыняліся ўнутр? Бо туды — ніяк: снегу столькі! Сялянская мудрасць. І яна — з радзімы.

Кампазітар Леанід Шурман напісаў музыку на мой верш «Я еду дахаты», і атрымалася шчымлівая песня:

...Я еду дахаты з гаркотай віны,
Што мама і тата вякуюць адны.
Каб маму і тату абняць мне паспець,
Я еду дахаты — а варта ляцець.

На канцэртах жанчыны, слухаючы гэтую песню, плачуць.

Майстар загалоўкаў

— Не так даўно пабачыла свет ваша новае выданне «Калаўрот хлапечых прыгод».

— А цяпер, дарэчы, у «Выдавецкім доме «Звязда» рыхтуецца кніга, дзе пад адной вокладкай сабрана, бадай, уся мая проза: апавяданні, кароткія былі і абразкі, якія на працягу дзесяці гадоў друкаваліся ў «ЛіМе» пад агульнай шыльдай «ЗЭКавычкі», публіцыстыка. Карацей, вінегрэт. У мяне ўжо выходзіў падобнага кшталту зборнік «мастацкай літаратуры», які так і называўся — «Вінегрэт пад фуршэт»: вясёлыя апавяданні, іранічныя вершы, байкі, сатырычныя мініяцюры, гумарэскі, эпіграмы, пародыі.

— Рыфма ў назвах кніг, як бачым, — ваша нязменная спадарожніца... Згадайма кнігі для дзяцей: «Зязюля Гулюля», «Мянтуз сярод мядуз», «Вожык вёз сараканожак», «Жмуркі з коткай Муркай», «Праўда і лухта пра вусатага ката», «Ці бывае, што карова лятае?»

— Я насамрэч люблю назвы рыфмаваныя — так, на маю думку, яны лепш запамінаюцца. У мяне з загалоўкамі ўвогуле звязана цікавая гісторыя. Калі я вучыўся ў Маскве ў Вышэйшай камсамольскай школе пры ЦК УЛКСМ і праходзіў стажыроўку ў «Комсомольской правде», то, напісаўшы свой першы матэрыял у газету, прынёс яго загадчыку аддзела. Ён выкрасліў загаловак адразу. Прачытаўшы матэрыял, кажа: «Добра, але падумай над загалоўкам». Я пайшоў, прыношу. А ён: «Што, адзін? Ідзі думай 20, 30, 40 варыянтаў!.. Нешта з усяго выберам!» А потым даваў артыкулы іншых аўтараў і прасіў, як заўсёды, падумаць над загалоўкамі. Я іх рабіў, ён прымаў. Аднойчы сустракае мяне на калідоры: «Чаму ты ганарар не атрымліваеш?» — «У мяне ж у гэтым месяцы не было нічога». — «А загалоўкі?» І я аслупянеў: за загалоўкі плацілі так, як і за публікацыі! Здзівілі не грошы, а тое, што працу ацанілі. Яшчэ студэнтам я пачаў працаваць у гомельскай раённай газеце «Маяк». Мой старэйшы сябар філолаг Саша Дуброўскі працаваў тут. Я прыязджаў да яго. Побач — саўгас «Брылёва», яблыневы сад. Мне давалі заданне: «Схадзі ў саўгас адзін, другі, напішы нам». Потым галоўны рэдактар запрасіў у штат. Паколькі пісаў я аб прафсаюзах, камсамоле, мяне ў арганізацыі прыкмецілі. Прапанавалі загадчыкам аргаддзела. Я не пагаджаўся. Але галоўны рэдактар раіў. Так я аказаўся ў камсамоле на тры гады. А потым паехаў у Маскву вучыцца, дзе была спецгрупа «Журналісты». Нас набіралася 17 чалавек з усяго Саюза. Я прадстаўляў Беларусь. Былі таджыкі, туркмены, грузіны і іншыя — прадстаўнікі з кожнай рэспублікі. Нас вадзілі ў газету «Правда». Спецкурс «Актуальныя праблемы маладзёжнага радыё і тэлебачання» выкладаў вядомы журналіст-тэлевізіёншчык Эдуард Сагалаеў, запрашаў у «Останкино» і паказваў, як здымаюцца перадачы. На размеркаванні ў ЦК УЛКСМ мне прапанавалі паехаць галоўным рэдактарам абласной маладзёжнай газеты «Хабаровский комсомолец». Ледзь адкруціўся, і то дзякуючы таму, што быў жанаты і меў сына. Перад гэтым я пагадзіўся ехаць інструктарам Гомельскага абкама камсамола. Да Масквы мяне выклікалі да загадчыка аддзела прапаганды ЦК камсамола Беларусі Анатоля Бутэвіча, які прапаноўваў працаваць у сваім аддзеле. Мікола Літвінаў, мой зямляк з Буда-Кашалёва, стаў загадчыкам сектара друку абкама партыі. Думаў з ім дамовіцца.

На размеркаванні дэканша зачытвала накіраванні, а другі сакратар ЦК УЛКСМ Мішын быў старшынёй камісіі. Мішын і аб'яўляе: «Я ўчора размаўляў з Шаплыкам — першым сакратаром ЦК УЛКСМ, і ёсць меркаванне адправіць Анатоля Зэкава ў распараджэнне ЦК камсамола. Ужо не інструктарам, а вышэй». Нападследак запытаў: «Ёсць пытанні?» Там пытанняў не задаюць — толькі адказваюць. І калі я сказаў «ёсць», дэканша ледзь не ўпала. А я спытаў: «Ёсць магчымасць трапіць у газету?» Мне адказалі: «На месцы дамовіцеся».

Журналістка Ядвіга Юферава, уласны карэспандэнт «Комсомольской правды», працавала ў сектары друку ЦК камсамола Беларусі. Прыходжу, а першы сакратар Шаплыка кажа: «Ядзяй мы былі задаволены — і ў вас усё атрымаецца». — «Дык я не ў газету іду?» — «Не, вы на месца Ядвігі, галоўны над прэсай». — «Дык я ў газету хацеў!».

Так я тут асталяваўся. Але летам хадзіў у тэнісцы, зімой — у світары, а трэба ж было ў пінжаку, зашпіленым на ўсе гузікі ды яшчэ пад гальштукам. Вось майму загадчыку Івану Сцяпуру і казалі: «Што ён тут як басяк ходзіць?» А я пінжакоў увогуле не люблю. «Скажы свайму пісьменніку, каб прыстойна апранаўся». А потым махнулі рукой: пісьменнікі — яны такія, формы не любяць!

Гумар — ад бацькі

— Анатоль, ваш бясспрэчны канёк — пародыі. Як усё пачыналася?

— Многа пародый у мяне стала выходзіць у «ЛіМе», калі я быў яшчэ студэнтам. Апошняя старонка ў кожным нумары штотыднёвіка была сатырычная. Рыхтаваў яе загадчык аддзела паэзіі Юрась Свірка. Памятаю, прыношу аднаго разу некалькі напісаных ад рукі пародый у рэдакцыю. Юрась Мікалаевіч бярэ і дзеліць іх на два стосы: адзін забірае, другі вяртае. Я пытаюся: «Што, слабыя?» — «Не, проста гэтых паэтаў мала хто ведае, пачаткоўцы пакуль. Аднясеш у "Чырвоную змену"».

Мне, хто ведае, кажуць, што лірыка ў мяне ад маці, а гумар — ад бацькі. Такія ж у мяне і сын, і ўнук: адказваюць небанальна, умеюць пажартаваць, а то і схітрыць.

Я год жыў пад іншым прозвішчам, бо бацька з маці былі нераспісаныя. Маці мая сірата. Яе забралі бяздзетныя муж і жонка з іншай вёскі. Мой бацька служыў у арміі на Чукотцы, Камчатцы, Сахаліне, Курыльскіх астравах. Пачатак 50-х гадоў. З маці перапісваліся. У яго чамусьці з галоснымі праблема была: ён пісаў імя маці «Нтшк» замест Наташка. Ужо ў старасці яны смяяліся: «Ты ж, аболтус, пісьмы мне пісаў, а галосных у імені маім не было», — скардзілася маці. «Старая, ты ведаеш, дзе я служыў, на якіх сакрэтных аб'ектах? Шыфраваў!»

А забраў маці ён вось як: у бабы з дзедам гэтая дзяўчына выхоўвалася, у арміі перапісваліся, прыйшоў — жаніцца вырашыў. А быў хуліганісты, усю вёску ў кулаку трымаў. Жыў з маткай і вось пайшоў забіраць жонку да сябе. Дзед з бабай сталі на дзверы: «Не аддадзім!» Мала таго, што хуліган, дык яшчэ каб свая дачка была, родная, а гэтая ж сіраціна — што ў вёсцы падумаюць: ім абы выпхнуць, бо не свая ж. Бацька зыркнуў на іх, скруціў у посцілку пасаг, адчыніў акно, выкінуў туды вузел і сказаў: «Ну і стойце! Пайшлі!» І праз акно павёў дамоў нявесту. Дык на старасці, калі сядзелі, успаміналі, маці казала: «Ты ж мяне праз акно замуж забраў!» А ён адказваў: «Калі б не хацела — не пайшла б. А так нясу пасаг, гляну — ідзе ззаду. А магла б не пайсці. Ну, прынёс бы ўсё назад». Пасля жаніцьбы яго хуліганства прайшло, потым я нарадзіўся, праз год — сястра. А бацька да дзевяноста гадоў, ужо на пенсіі, не вылазіў са сваёй майстэрні. І для сябе рабіў, і заказы вяскоўцаў выконваў. Добрую памяць пра сябе пакінуў.

— Ад пісьменніка ж застануцца творы, дзе мудрасць яго землякоў, краса яго краю, замілаванне жыццём на радзіме. Дзякуй, Анатоль Мікалаевіч, за размову!

Гутарыла Наталля СВЯТЛОВА

Шукаем юныя таленты

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі аб'яўляе літаратурны конкурс, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Мінска і Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца вучні, студэнты, моладзь ад 12 да 30 гадоў.

На разгляд прымаюцца творы шырокай тэматыкі, прысвечаныя як гераічнаму мінуламу, так і сённяшняму дню — мужнасці абаронцаў і вызваліцеляў, мірнаму часу, стваральнай працы, шчаслівай будучыні, сяброўству, супрацоўніцтву, вучобе і добрым справам дзяцей і моладзі, якія ганарацца сваімі мужнымі дзядамі і прадзедамі.

Конкурс праводзіцца ў намінацыях:

«Малая проза» (апавяданне, навела, эсэ);

«Паэзія» (не болей як 3 вершы, адна паэма);

«Публіцыстыка» (нарыс, артыкул, рэпартаж, інтэрв'ю).

Творы на беларускай або рускай мовах прымаюцца да 20 мая 2024 года.

Работы, набраныя на камп'ютары, дасылаць на адрас: 220034, Мінск, вул. Фрунзэ, д. 5, пакой 308. МГА СПБ. Або на электронную пошту:

mgo-oo-spb@mail.ru

Вынікі будуць абвешчаны на ўрачыстым творчым свяце ў чэрвені. Лаўрэаты атрымаюць дыпломы, памятныя сувеніры і падарункі. Найлепшыя творы будуць прапанаваны ў друк.

Тэлефоны для даведак: 343-18-18; 392-59-06; 392-59-07.

Міхась ПАЗНЯКОЎ,
старшыня Мінскага гарадскога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

«У век камп’ютарны — з душой жывой»

Хораша, калі ў чалавека ёсць надзейны сябра. Яшчэ лепш, калі ён і твой зямляк. Як Мікола Маляўка для Казіміра Камейшы. Паколькі абодва паэты, пра свае пачуцці не грэшна прызнацца і прылюдна. Што і зрабіў Мікола Аляксандравіч у вершы «На міг спыніўся — па дарозе ў вечнасць»:

Мы нарадзіліся з табой зімой
І гартаваліся ў народнай гушчы.
Ты верны сябар, светлы і трывушчы
У век камп’ютарны — з душой жывой,
Без німба велічы над галавой.
То побач як радня, то невідушча
Цябе ў жыцці падтрымлівае пушча,
Мяне другі сучаснік — Нёман мой.

Пісалася гэта яшчэ ў 2018 годзе. А магло напісацца б і сёння. Прамаўлялася тады ў сувязі з юбілеем Казіміра Вікенцьевіча. Актуальна гучыць і сёння, бо зноў у яго набліжаецца юбілей. Больш значны і важкі, чым папярэдні. Толькі галоўнае — не пражытыя гады (дай Божа, каб іх было і надалей шмат!). Куды важней, што пажаданне, выказнае раней, гэткае ж актуальнае. Казімір Камейша працягвае жыць «у век камп’ютарны — з душой жывой». Што гэта так, упэўнівашся і знаёмячыся з кнігай «Казімір Камейша: “Неба веку твайго — узлёт высокі…”»

Умець глядзець на дрэвы

Адкрываецца яна раздзелам «На стыку двух вякоў», змест якога складае аўтабіяграфія Казіміра Вікенцьевіча «Галоўная вярста», а таксама іншыя матэрыялы, што ў той ці іншай ступені маюць дачыненне да яе. Чытачы, якія добра ведаюць яго творчасць, даўно ўпэўніліся, наколькі ён арыгінальны не толькі паэт, але і празаік. Як правіла, у аснову аповедаў, навел, літаратурных запісаў кладзе розныя сюжэты як з уласна перажытага, так і выпадкі з жыцця іншых людзей.

Гэта, аднак, не звычайнае адлюстраванне таго, што было, а дакументальна-мастацкая проза, якая не проста мае цікавую інтанацыю, а дазваляе ўбачыць зрэз жыцця, калі штосьці звычайнае ператвараецца ў тыповае. Нават з ярка выяўленым аўтабіяграфічным харатарам, бо за канкрэтным лёсам, у дадзеным выпадку сваім, паўстае і жыццё пакалення ваенных і пасляваенных гадоў, да якіх і належыць Казімір Камейша.

Гэтае «сваё», для прыкладу, у нарысе «Пятак на шчасце» надзіва ўражвае тым, як апавядальнік сваю любоў да літаратуры перадае праз згадкі пра наведванне вядомых гістарычных мясцін. Атрымалася дыхтоўна напісаная проза, пасля знаёмства з ёю адчуванне такое, што заглыбіўся ў паэзію. Не рыфмаваную, а такога ўнутранага гучання, калі слова само па сабе бярэ ў палон. Смакуеш яго сэнсавую і эмацыянальную нагрузку: «Верхняе Панямонне… Старажытная латапісная Літва, як сцверджана гісторыкамі, была менавіта тут. Варта ўслухацца толькі чуйным сэрцам, і можна пачуць тут крокі самога Міндоўга, які ў 1253 годзе каранаваўся ў Наваградку “на каралеўства Літоўскае”. Сэрца можна адчуць толькі сэрцам. А тут было і сэрца вялікай дзяржавы».

Адразу быццам нечаканы пераход: «Трэба ўмець глядзець на дрэвы. Калі ў іх галінах густа пераплялася пушчанская прыгажосць, дык там, у карэнні, хаваецца густое перапляценне самой гісторыі. Галіны гісторыі часам заблытаны так, што іх нялёгка разблытаць самым дасціпным і ўвішным гісторыкам».

Хоць чаму нечаканы? Ён якраз да месца, бо сваім суседствам таксама даўняе і сучаснае дазваляе лепш спазнаць гісторыю. І тое, што Казімір Камейша апавядае пра сваё маленства, у меншай ступені юнацтва, пра зямлю, на якой знаходзіцца Налібоцкая пушча, таксама дае магчымасць перайсці ад прыватнага да галоўнага і, пішучы свой лёс, адначасова ўзнаўляць лёс усёй Беларусі.

Усё, як верасовае

Раздзелы «Сяброўскае слова» і «Постаці», хоць і стаяць не поруч, у нечым звязаныя. Аб’ядноўвае іх тое, што аўтары ў абодвух разважаюць пра некаторыя важкія мастакоўскія набыткі беларускай літаратуры. Толькі з той розніцай, што ў першым з іх калегі па пяры прамаўляюць слова пра самога Казіміра Камейшу, а ў «Постацях» — яго слова пра тых, чыя творчасць асабліва ўразіла. У «Сяброўскім слове» змешчаны і верш Міколы Маляўкі «На міг спыніўся — па дарозе ў вечнасць», радкі з якога прыведзены ў пачатку гэтых разваг. Слова пра Казіміра Вікенцьевіча прамаўляюць таксама Мікола Аўрамчык («Выток»), уражаннямі ад прачытаных яго кніг дзеляцца Алесь Марціновіч («Самы лясны паэт») і Рыгор Барадулін («Верасовая кніга»).

Несумненна, чытач, які ведае цану сапраўднай паэзіі, асабліва спыніць увагу на прамоўленым Рыгорам Іванавічам. Калі паставіцца да напісанага Казімірам Камейшам уважліва, непрадузята, лёгка заўважыць, што ў яго з Рыгорам Барадуліным ёсць тое агульнае, што часам у вочы і не кідаецца, а пры ўважлівым чытанні адразу адчувальна. Сказанае Рыгорам Іванавічам дазваляе лепш зразумець, якога непаўторнага творцу мае сучасная беларуская літаратура ў асобе «самага ляснога паэта».

Каб упэўніцца, наколькі гэта адпавядае ісціне, дастаткова такога сведчання: «Аднойчы Рыгор Бярозкін сказаў пра аднаго паэта: “Дужа я люблю яго, ды калі б мог знайсці ў яго хоць два радкі сапраўднае паэзіі, напісаў бы самы лепшы артыкул”». Пасля гэтага Рыгор Барадулін задае пытанне і сам на яго адказвае: «Чаму прыгадаў мэтра, ды таму, што ўвесь час лавіў сябе на жаданні цытаваць і цытаваць Казіміра Камейшу. Дужа ж ашчадны і віртуозны. Вытанчаны і, калі трэба, хуліганісты паэт. Калі хацеў дагадзіць, дык толькі паэзіі».

Важкая і такая выснова Рыгора Іванавіча: «І колькі спакусаў ні было, колькі варункаў рознааблічылася, паэт Казімір Камейша застаўся верны сваёй пушчы, шум якой пранёс з сабою паўсюль, сваім бацькам, чые вобразы адуховіў словам, беларускай мове, якую збярог і па-сыноўску бароніць. (…) Паэт убачыў, як пчала чытае верасовую кнігу. А мне здаецца, што ўсе вершы і паэмы Казіміра Камейшы — якраз і ёсць тая верасовая кніга, якую нашаптала, нагаманіла, наскрыпела, настагнала, нагула Налібоцкая пушча».

Супраць заспакаення

Паміж гэтымі двума раздзеламі стаяць развагі «Знайсці сябе ў сябе самога». Пра што яны, відаць з падзагалоўка «Роздум пра паэзію». Раздзел гэты — засяроджаны, уласнай творчасцю асэнсаваны і выпакутаваны. Само па сабе гэта ўжо важна, але існуе і больш істотнае. Тое, што не проста дэкларуецца, няхай сабе і з аб’ектыўнай зясяроджанасцю, а ідзе з уласнай творчай практыкі. Камейша-крытык, даследчык тым і цікавы, што не столькі прамаўляе важныя мастакоўскія ісціны, колькі ў сваіх высновах ідзе ад уласнага творчага вопыту.

Ён не з тых, хто ведае, як трэба пісаць вершы, а калі бярэцца за пяро, не ідзе далей звычайнага вучнёўства. Ён сам піша выдатныя вершы. Наўрад ці калі асабліва задумваецца, у якім жанры канкрэтна праявіць сябе. У гэтым для яго няма ніякай патрэбы, неабходнасці, бо плынь думкі нараджаецца, як усё існае ў гэтым свеце і Сусвеце. Не «ізмы» яго хвалююць. Ён жыў і жыве паэзіяй. Абыякавасць, раўнадушша — для яго не той стан, які можна хоць неяк апраўдаць.

Зразумела, тое, што хутка працытую, не ад уласнага жадання прамоўлена, але яно і зусім не для супакаення. Яно для іншых. Для тых, хто не засвоіў гэтую існасць, а ў выніку, сам таго не заўважаючы, у многім абядняе сябе, непрыкметна збочвае з правільнага шляху: «Часу можна ўсё дараваць, можна шмат чаго дараваць і паэту, што ў старасці любіць выціснуць з сябе сентыментальную слязу, нельга толькі дараваць раўнадушша, якое ад чытача ніколі не схаваеш. Там, дзе вакол шмат абыякавасці, чэрствасці, неахайнасці, звычайнага хамства, паэт павінен падаваць свой голас першым, а не быць нейкім падобным сузіральнікам. Вядома, крок першапраходца заўсёды цяжкі і адказны, часам нават рызыкоўны. Але паэзія здольная на ўсё, на што здольны сам чалавек».

Гады — паўбяды

На што здольная сапраўдная паэзія, Казімір Камейша абгрунтоўвае ў аналізе творчасці Аркадзя Куляшова («Непаўторны Куляшоў»), Алеся Звонака («Праз віхуры і далечы»), Міколы Аўрамчыка («Мы развіталіся ў вясне»). Дарэчы, Мікола Якаўлевіч неаднойчы прысутнічае ў гэтай кнізе, бо іх шляхі з Казімірам Вікенцьевічам, нягледзячы на вялікую розніцу ў гадах, не аднойчы перасякаліся. Ды і было яшчэ творчае пабрацімства. Мікола Аўрамчык, як вядома, ахвотна падтрымліваў маладых паэтаў, шмат гадоў узначальваючы аддзел паэзіі ў часопісе «Маладосць».

Зразумела, што і Казімір Камейша да яго ставіўся прыязна. Пачатак гэтаму быў пакладзены яшчэ ў раннія гады: «Ён быў самым любімым паэтам маёй маладосці. Мяне, пушчанца, тады, на пачатку шасцідзесятых гадоў, прывабіла і захапіла яго “Беларуская сасна”. Я і дыпломную сваю ва ўніверсітэце пісаў менавіта па ягонай творчасці і меў за гэта найвышэйшую адзнаку».

Пераход ад згадак шмат у чым асабістых да творчасці свайго любімага паэта (гэта тычыцца не толькі Міколы Аўрамчыка) — мастацкі прыём, якім Казімір Камейша карыстаецца неаднаразова. Ён, дзякуючы падбору цікавых згадак, фактаў, апраўданы, бо таксама ў пэўнай ступені сведчыць аб тым, наколькі правільная выснова Іагана Гётэ «Сухая, сябар мой, тэорыя паўсюль. А дрэва жыцця пышна зелянее!» Гэта не ў апошнюю чаргу тычыцца і творчасці пэўных пісьменнікаў. Жыццёвыя і творчыя рэаліі з іх біяграфій дапамагаюць лепш зразумець, як адбывалася фарміраванне таленту. Тым больш што ў Казіміра Камейшы назіранняў шмат, бо з многімі літаратарамі сустракаўся неаднаразова.

Несумненна, чытач, які ведае цану сапраўднай паэзіі, асабліва спыніць увагу на прамоўленым Рыгорам Іванавічам. Калі паставіцца да напісанага Казімірам Камейшам уважліва, непрадузята, лёгка заўважыць, што ў яго з Рыгорам Барадуліным ёсць тое агульнае, што часам у вочы і не кідаецца, а пры ўважлівым чытанні адразу адчувальна. Сказанае Рыгорам Іванавічам дазваляе лепш зразумець, якога непаўторнага творцу мае сучасная беларуская літаратура ў асобе «самага ляснога паэта».

Апавядаючы пра іх, ён у пэўнай ступені апавядае і пра сябе. Аднак гэта не перашкаджае ва ўсім і ўсюды заставацца самім сабой. Не толькі «самым лясным паэтам», але і правабярэжцам («Правабярэжац» называецца і верш, які завяршае кнігу). Глыбокі сэнс закладзены ў радках. У рэшце рэшт, хіба ён можа быць іншым у творцы, пяро якога пасталела, але не прытупілася. Ды яшчэ застаецца «ў век камп’ютарны — з душой жывой»:

З-пад Нёмна наша ўзыходзіць сонца,
Цвітуць лугі і растуць стагі.
Мы ўсе — пушчанцы і занямонцы —
Па два зялёныя берагі.
……
Правабярэжац я, свой, як праўда,
Сан занямонца ў мяне і чын.
Я маю гонар і маю права
Спяваць пра ўсё і яго берагчы.

Завяршэнне твора: «Жыву, як кажа мне бацька Нёман, // Як раіць маці мая — Сула» — той аптымізм, які з гадамі не знікае. Узросту цяжар, канешне, для кожнага адчувальны, але нездарма кажуць: нам гады — паўбяды, калі настрой не пакідае.

* * *

У гэтым і ўпэўніваешся, знаёмячыся з кнігай «Казімір Камейша: “Неба веку твайго — узлёт высокі”». Яна з’явілася ў серыі «Асоба і час», да выхаду якой спрычынілася выдавецтва «Чатыры чвэрці». Пачатак гэтай своеасаблівай бібліятэчцы «Пра час і пра сябе» быў пакладзены аповедам «Анатоль Аўруцін: лёс і творчасць». Пасля гэтага чытачы, зацікаўленыя найлепшымі дасягненнямі сучаснага прыгожага нацыянальнага пісьменства, лепш зразумелі, пра што і як пішуць Алесь Савіцкі, Уладзімір Гніламёдаў, Васіль Макарэвіч, Янка Сіпакоў і іншыя. Можна не сумнявацца, што добры пачатак па-ранейшаму будзе мець годны працяг. Інакш і быць не можа. Тое, што стала справай жыцця, не мае права на спыненне.

Язэп ЛІТВІНОВІЧ

Ахвярам спаленых вёсак прысвячаецца

У Выдавецкім доме «Звязда» пабачыла свет кніга мастацкіх і дакументальных твораў пісьменнікаў Міншчыны, прысвечаных Хатыні і іншым беларускім паселішчам, якія былі спалены ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



Ініцыятарам стварэння зборніка выступіла Мінскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі. Сярод аўтараў — Яўген Пясецкі, Мікалай Смірноў, Леанід Крыванос, Галіна Нічыпаровіч, Галіна Нупрэйчык, Алесь Карлюкевіч, Уладзімір Цанунін, Лёля Багдановіч, Рыгор Саланец, Ірына Карнаухава, Віктар Сабалеўскі, Таццяна Цвірко, Вольга Савасцюк, Валянціна Гіруць-Русакевіч, Рэгіна Рэўтовіч, Антон Анісовіч, Марыя Шакун, Іна Фралова, Людміла Круглік, Аляксандр Пастушкоў, Аляксей Шаўцоў, Лідзія Навумава, Аляксандр Плавінскі, Наталля Жылевіч, Наталля Жызнеўская, Лілія Мялешка, Віктар Кажура, Васіль Цішкевіч, Зінаіда Гасціловіч, Славамір Даргель, Алена Разумоўская, Тамара Бярэзіна. Уключана і перакладзеная на беларускую мову паэма калмыцкага пісьменніка Міхаіла Хонінава «Званы Хатыні». Яе аўтар партызаніў на Міншчыне, з'яўляецца ганаровым грамадзянінам горада Беразіно. Перакладчыкі твора на беларускую мову — Адам Шостак і Рагнед Малахоўскі. Дарэчы, Р. Малахоўскі і ўкладальнік кнігі.

З прадмовы Леаніда Крыванаса «Літаратурная вахта памяці»: «У 2023 годзе споўнілася восемдзесят гадоў з трагічных падзей, якія адбыліся 22 сакавіка 1943 года. Кажуць, што на сёння ўжо памінутрапіць у вогнішча двойчы. Хатынскія дзяўчынкі Юлія Клімовіч і Марыя Федаровіч, як і Іосіф Камінскі, выжылі ў падпаленым хляве. Абгарэлых падлеткаў сваякі завезлі на суседні хутар Хварасцені. Іх выхадзілі. Але праз некаторы час нямецкія карнікі дабраліся і да гэтага паселішча. Разам з сям'ёй, якая прытуліла іх, адна з дзяўчынак была зажыва спалена ў хаце, а цела другой знайшлі ў калодзежы на тым жа хутары. Імёны пакутніц уключылі ў спіс знішчаных жыхароў Хатыні і змясцілі на сямейныя шыльды, усталяваныя на мемарыяле. Жудасны лёс. Пра гэта трэба не толькі памятаць, але і публічна выказваць свае пачуцці.

Мінскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі да 80-х угодкаў Хатынскай трагедыі правяло літаратурны марафон памяці ахвяр Хатыні і іншых спаленых вёсак Міншчыны. Удзел у ім прынялі паэты, празаікі і публіцысты аддзялення, калегі-землякі са сталічнай арганізацыі, прадстаўнікі аматарскіх літаратурных аб'яднанняў вобласці. Іх творы змяшчаліся на інтэрнэт-сайце аддзялення і склалі зборнік "Званоў перазвон". Чаму такая назва? Бо памінальны звон, што праз кожныя паўхвіліны раздаецца над мемарыялам, парушаючы лясную цішыню, выклікае пачуцці, якія адзін з аўтараў назваў "рэінкарнацыя болю", а другі — "вібрацыяй памяці".

Лічу, што дадзеная кніга ўяўляе сабой не толькі творчы погляд сучасных літаратараў на трагічную гістарычную падзею, гэта яшчэ і наша літаратурная вахта памяці».

Кніга, выдадзеная накладам у 500 экзэмпляраў, вартая таго, каб знаходзіцца ў кожнай школе, у кожнай бібліятэцы вобласці, у іншых рэгіёнах нашай краіны. Поруч з мастацкім і дакументальным расповедам пра Хатынь у зборніку прадстаўлены творы, якія прысвечаны спаленым вёскам Случчаны (нарыс Васіля Цішкевіча «Апошнія сведкі…»), Вілейшчыны (верш Віктара Кажуры «***Ад паразаў немец ашалелы…»), Пухавіччыны (нарыс кандыдата гістарычных навук Аляксандра Плавінскага «Трагедыя вёсак Балоча і Маяк Пухавіцкага раёна», нарыс Вольгі Савасцюк «Сярод белых бяроз. Ваенны лёс вёскі Беразянкі»), паселішчам Міншчыны ў іншых раёнах. Адкрываючы старонкі зборніка, можна выкарыстоўваць мастацкія творы як дакументы сэрцаў і душ, занепакоеных захаваннем гістарычнай памяці беларускага народа, сэрцаў і душ, якія прапусцілі праз сябе ўвесь боль, усё драматычнае гучанне слова «генацыд»…

«Калісьці пад Вілейкай вёска // Была пазначана на карце. // Цяпер маўклівыя бярозкі // Стаяць на варце. // Зялёнашэрай паласою // За полем узараным — хвоі.// Вайна бязлітаснай касою // Скасіла тут усё жывое. // Звычайным быў вясновы ранак.// Ды раптам на дарозе чыстай // З узлеску ўзнікла нечакана // Калона карнікаў-фашыстаў. // Агонь над дахам заскуголіў. // Слуп дыму ў неба ўзняўся горкі… // І засталося толькі поле // Там, дзе былі калісьці Боркі» (Уладзімір Цанунін, верш «Боркі»). Вёска Боркі Вілейскага раёна спалена ў маі 1943 года батальёнам Дзірлевангера падчас аперацыі «Сарвігалава» разам з 97 жыхарамі.

У кнізе ёсць уклейка з рознымі ілюстрацыйнымі матэрыяламі, звязанымі найперш з Хатынню. Але яшчэ ёсць і фатаграфічныя выявы газетных палос «раёнак» Мінскай вобласці. Газетныя старонкі вяртаюць нас у 1969 год, калі пачаў сваю працу мемарыяльны комплекс «Хатынь». Ёсць і паведамленне БелТА ад 30 чэрвеня — «Хатынскі набат»: «Закладка урны мемарыяльнага комплексу "Хатынь" зямлі з вёсак, поўнасцю знішчаных фашысцкімі акупантамі і не адроджаных пасля вайны». Вось і словы намесніка старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. Ф. Клімава: «Сёння, напярэдадні слаўнага свята беларускага народа — 25-годдзя вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, мы сабраліся тут для таго, каб зрабіць вельмі важны акт перад адкрыццём Хатынскага мемарыяльнага комплексу. Захоўванне ў гэтым комплексе зямлі з вёсак, знішчаных гітлераўцамі і не адроджаных у пасляваенны перыяд, з'яўляецца данінай нашага народа велізарным ахвярам, панесеным у імя перамогі, усім тым, хто сваёй смерцю пракладваў дарогу ў наш сённяшні дзень». І 1969 год — ужо гісторыя. Гісторыяй становіцца і наш сённяшні час, час ушанавання гераічнай памяці беларускага народа. І, канешне ж, клопат мастакоў слова — занатоўваць гэты час, выкладаць сваю грамадзянскую і творчую пазіцыю ў дачыненні да мінулага і сучаснага ўсведамлення даўніх падзей.

Кастусь ХАДЫКА

Дварцовыя гісторыі з Чашніччыны

Вы нарадзіліся ў вёсцы і лічыце сваю малую радзіму найлепшым куточкам на карце свету? Тады знаёмцеся з Дварцом. Магчыма, гэтая сустрэча дапаможа захаваць гісторыю яшчэ не адной беларускай вёскі…

Педагог, паэт, пісьменнік, бард, краязнаўца, аўтар больш чым дзясятка кніг Аляксандр Вашчанка жыве ў Мінску, але малая радзіма не адпускае. Бацькоўскі дом, дзе прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады, знаходзіцца за некалькі кіламетраў ад райцэнтра. На Чашніччыне Аляксандр Пятровіч рабіў першыя крокі ў педагогіцы. Тут жывуць яго вучні, сябры, сваякі.

Гэтым летам Аляксандра Пятровіча гасцінна прымалі ў Чашніцкай раённай і сельскай Дварэцкай бібліятэках. Творца выканаў свае песні пад гітару. Ды галоўная тэма гутаркі — новая кніга — «Гісторыя паселішча Дварэц» — бясцэнны падарунак малой радзіме. Пачаць працу над кнігай падштурхнула жаданне захаваць гісторыю роднага сяла і данесці яе нашчадкам.

...У Беларусі каля двух дзясяткаў вёсак з назвай Дварэц, гісторыі іх шмат у чым падобныя, і кожная ўнікальная. Убачыць, зразумець і перадаць непаўторнасць зямлі, на якой нарадзіўся і вырас — пад сілу чалавеку, па-сапраўднаму закаханаму ў яе. Такім паўстае перад чытачамі аўтар згаданай кнігі.

«Гісторыя паселішча Дварэц» — і энцыклапедыя, і лірычная споведзь. Рыхтуючы матэрыял, наш зямляк шмат часу правёў у архівах. Выданне змяшчае цікавыя гістарычныя звесткі, яны тычацца не толькі Дварца, але і іншых населеных пунктаў раёна.

Першыя паселішчы на тэрыторыі згаданай вёскі з'явіліся ў глыбокай старажытнасці. Раскопак у гэтых месцах не праводзілася, аднак не раз бывалі вядомыя навукоўцы-археолагі, напрыклад, Георгій Штыхаў. Апошніх прыцягвала гарадзішча, якое знаходзіцца непадалёк ад сучаснага сяла. Аўтар успамінае, як у дзіцячыя гады разам з сябрамі капаўся ў пясчаным абрыве, знаходзячы нейкія чарапкі.

У кнізе закрануты найважнейшыя падзеі XIX — пачатку XX стагоддзяў, якія не прайшлі бясследна для дварэцкіх жыхароў і насельніцтва Чашніччыны. Аляксандр Вашчанка згадвае пра будаўніцтва Бярэзінскай воднай сістэмы, вайну з Напалеонам, рэформу 1861 года, Першую сусветную вайну, Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю, калектывізацыю, Вялікую Айчынную...

Аўтар змог сабраць адметныя звесткі аб прыродзе Дварца, занятках жыхароў і традыцыях вёскі, школе, царкве, мясцовай кулінарыі і нават складзі вясковы слоўнік.

Раздзел «Апісанне дамоў і жыхароў вёскі Дварэц» займае асноўную частку кнігі, у якой амаль трыста старонак. Шмат рэдкіх фатаграфій з альбомаў самога аўтара і аднавяскоўцаў. Да стварэння кнігі Аляксандр Пятровіч прыцягнуў сваіх землякоў. Са здымкаў глядзіць вёска трыццатых, саракавых, шасцідзясятых, сямідзясятых... У іх — боль і радасць роднай зямлі.

Вось даваеннае сямейнае фота Вайцяховічаў, на ім — Віктар Вайцяховіч (1900—1943), які загінуў у канцлагеры. Тэма Вялікай Айчыннай асабліва блізкая стваральніку вясковай хронікі. Не забыты ні адзін ветэран. У ліку слаўнай кагорты — бацька Пётр Вашчанка, баец Чырвонай Арміі. Яго франтавыя фотаздымкі — на старонках кнігі сына.

А хіба можна ўявіць беларускую ваенную вёску без партызан? Пра будні брыгады «Дубава» аўтару давялося шмат чуць ад маці і яе сяброўкі. Дварэцкія дзяўчаты разам з мужчынамі бясстрашна ваявалі з ворагам. А Надзея Грыбоўская, настаўніца Дварэцкай школы, нават ордэнам Чырвонай Зоркі ўзнагароджана. Сведчанні былых партызанак, дапоўненыя здымкамі, арганічна ўплятаюцца ў сюжэт кнігі.

Жыццё не раз пераконвала: з беларускай глыбінкі выйшла шмат вядомых людзей. У «Гісторыі паселішча Дварэц» згадваецца пра вядомага пісьменніка і алімпійскую чэмпіёнку.

Вісарыён Гарбук — пісьменнік, якога сёння ведаюць нямногія. У 60-я пра Гарбука шмат гаварылі і называлі яго беларускім Карчагіным. Нарадзіўся ў Полацку. Але пасля смерці яго бацькі сваякі маці забралі ўдаву з 4-гадовым сынам да сябе. Пражывалі блізкія пісьменніка ў вёсцы Вішанькі на Чашніччыне, якая знаходзіцца за некалькі кіламетраў ад Дварца. Шлях да ведаў Вісарыёна пачаўся ў Дварэцкай пачатковай школе. Далей — Чашніцкая сямігодка рабочай моладзі, Лепельскае педвучылішча. З дыпломам педагога вяртаецца ў родныя мясціны і два гады працуе ў Дварэцкай няпоўнай сярэдняй школе, працягваючы завочную вучобу на літаратурным факультэце Мінскага педінстытута, захапляецца паэзіяй. У 1935-м яго пераводзяць на стацыянарнае аддзяленне, і Вісарыён аказваецца ў Мінску, у цэнтры літаратурнага жыцця. Перад ім адкрываюцца велізарныя перспектывы, але за бяскрыўдную рэпліку ў адрас правадыра народаў аказваецца ў турме. Тры гады папраўчых лагераў. Вярнуўся на радзіму ў 1940-м. Неўзабаве грымнула вайна. Гарбука прызываюць у Чырвоную Армію. Служыў у інжынерных войсках, Дзень Перамогі сустрэў у Берліне. Яшчэ знаходзячыся ў Польшчы, з лістоў землякоў даведаўся, што ўсе родныя разам з іншымі жыхарамі спалены фашыстамі ў Вішаньках у сакавіку 1944-га. У 1946-м цяжка захварэў і ледзь хадзіў. Неабходна было змяніць клімат, прыйшлося з'ехаць у Пяцігорск. Там атрымлівае вестку аб прыёме ў члены Саюза пісьменнікаў Беларусі і прысваенні звання заслужанага работніка культуры Беларусі. На радзіму вярнуцца так і не змог, пахаваны ў Пяцігорску.

Чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў у Мельбурне 1956-га года (штурханне ядра) Тамара Тышкевіч нарадзілася ў Іканках, але часта бывала ў Дварцы. Адлегласць паміж дзвюма вёскамі — усяго некалькі кіламетраў, да таго ж тут таксама жылі яе сваякі, бо мама родам з Дварца. Напярэдадні вайны бацькі з'ехалі з дачкой у Ленінград. А летам 1941-га яна прыехала на канікулы ў Беларусь. Ваеннае ліхалецце будучая алімпійская чэмпіёнка перажывала на Чашніччыне. Назаўсёды захавала прыхільнасць да беларускай зямлі і землякоў. Ніколі не прапускала магчымасці пабываць на радзіме. Дварэцкія сваякі ўспамінаюць, што спартсменка вельмі любіла беларускую згушчонку, і яны стараліся радаваць яе пасылкамі з ласункам.

У кнізе Аляксандра Вашчанкі шмат цікавых гісторый і фота з вясковага юнацтва аўтара. Аўтар прыводзіць чытача ў кожны дом, у кожную сям'ю, даючы магчымасць радавацца і суперажываць разам з героямі. «Жывіце з любоўю да Радзімы і з надзеяй у сэрцы», — такімі словамі завяршае сваю працу Аляксандр Вашчанка.

Ірына ТОРБІНА

Віктар ШНІП

Балада Міхаіла Філіповіча

(8.06.1896—1947)

Няма нічога прыгажэй, чым горад,
Дзе нарадзіўся ты і дзе жывеш.
Малюеш Мінск. Плыве па рэчцы холад
З лістотай, што як кветкі, і плыве

Твая душа натхнёная за імі
Не для таго, каб ад журбы ўцячы,
Каб колеры жыцця былі жывымі
І ў фарбах не было глухой начы.

Яшчэ зіма далёка за лясамі.
І ты людзей малюеш і святло
Зямлі, якая будзе вечна з намі,
А мы з зямлёй, чаго б тут не было.

Спакойна дзень па Свіслачы сплывае.
І ты вяртаешся з карцінаю дамоў.
Скрыгочуць прытамлёныя трамваі,
Нібы злуюцца на цябе ізноў,

Што ты задумаў зноў пакінуць горад.
І ты яго пакінеш назаўжды,
І ў небыццё сплывуць лістота й холад
З карцінамі, дзе ў квецені сады…

Балада Івана Ахрэмчыка

(3.12.1903— 9.03.1971)

Зноў акно майстэрні, быццам амбразура…
Ці то выбухі, ці зноўку гром грыміць…
І твая душа не знае перакураў.
У душы вайна мінулая сядзіць.

Абаронцаў Брэсцкай крэпасці малюеш
Так, бы крэпасць сам абараняеш ты.
Ты паранены і смерць паблізу чуеш,
І няма патронаў, і няма вады.

І ніхто не здасца ворагам праклятым.
Не счужэе неба, дзе святло кіпіць…
Ты малюеш моўчкі, не ідзеш дахаты,
Бо вярнуцца цяжка, бо душа гарыць.

…Зноўку гром працяжны за акном
майстэрні
І гудуць машыны, грукат ля дзвярэй.
Са стала апошні скамянелы пернік,
Як апошнюю гранату, ты бярэш.

Абаронцаў Брэсцкай крэпасці малюеш
Так, бы крэпасць сам абараняеш ты.
Ты паранены і смерць паблізу чуеш,
І няма патронаў, і няма вады…

Балада Нінэль Шчаснай

(25.10.1933—15.05.2013)

Дзяўчынка са сланечнікам і сонца,
І цэлы свет, што створаны табой,
Больш не паўторацца.
Ім жыць бясконца,
Пакуль усё не змыецца вадой…

Твае шкляныя птушкі знаюць неба,
У іх жыве агонь, а ў ім душа
Твая пакінула крывінкі срэбра
І золата, і сцерлася мяжа

Паміж святлом зямным і цемнатою,
Што па-над намі зоркамі цвіце.
І шкло цячэ праз Полацк Палатою
І лесам палымнеючым расце.

І восень затапляе ўсе дарогі,
Дзе твой кастрычнік цепліць на кастрах
Туман апошні. Грэюць птушкі ногі
Каля рабін і ў залатых стагах.

Ты зноў малюеш сонца і сланечнік…
Але табе іх больш не ажывіць…
Шкляныя птушкі за табой у вечнасць
Лятуць, каб гнёзды там ля зорак звіць…

Балада Анатоля Тычыны

(11.05.1897—12.12.1986)

Мост новы па-над Свіслаччу ракою,
І ты з яго любуешся, глядзіш
На горад, што расце перад табою,
Дзе па вадзе сышлі грамы і ціш,
І пыл жыцця нядаўняга, старога…
Малюеш Мінска сонечныя дні,
Дзе ў музыцы паветра залатога
Рассыпаны будзённасці агні,
Што ў Свіслачы люструюцца,
трапечуць,
І за чаўном няспешлівым плывуць.
І праз аблокі прарастае вечар
І птушкі ў ім нябачныя лятуць
У новы час, які не за гарою,
Куды мы ўсе, бо дзень прайшоў, ідзём
Праз новы мост над Свіслаччу ракою,
Дзе рана-позна лісцем праплывём
З тых дрэў, якія пасадзілі ўчора…
І ты глядзіш на човен, у якім
Табе ніколі не даплыць да мора.
А як хацеў ты плыць у чоўне тым!

Балада Аляксея Глебава

(24.03.1908—2.10.1968)

Перад табой сучаснасць і стагоддзі —
Табе пазіруе Францыск Скарына.
Па небе слізгаюць, як снег па лёдзе,
Аблокі, для якіх твая Айчына
Звычайная зямля, як неба гэта,
Бязмежнае, дзе валадарыць вецер.
А ты ізноў, забыўшыся пра лета,
З майстэрні не выходзіш, нібы ў свеце
Няма нікога больш,
а ёсць Скарына
Адзін і ты, і шчасце ад натхнення.
І дрэва, што ў руках тваіх, як гліна,
Жыве, не забываючы карэнне,
Якім трымалася зямлі й трымала
Зямлю, каб нарадзіліся аднойчы
На ёй Скарына, Багушэвіч і Купала,
І ўсе мы выйшлі з непрагляднай ночы
За імі ўслед. І ты ідзеш няспынна
Па Полацку і вечнасць пазнаецца.
І ўслед табе і нам глядзіць Скарына
І радасна ўсміхаецца ад сэрца
Усім, хто азірнецца…

Балада Аляксандра Кішчанкі

(13.05.1933—11.11.1997)

Табе не да сланечнікаў Ван Гога,
У нас свае сланечнікі, і ты
Малюеш іх, нібыта ўсмешкі Бога,
Што вечнасць асвятляюць і гады,
Дзе мы жывём і дзе жывое неба,
Дзе продкаў душы і дзе будзем мы.
І мы ў сусвеце не адны і трэба
Глядзець на зоры так, як на дамы,
Што нас чакаюць.
Ты ствараеш сонца,
І напаўняецца прастор цяплом,
І робіцца жыццё, як час, бясконцым,
І з залатым вялікім жыватом
Жанчыну ты малюеш, і жанчына
Ідзе няспешна па жыцці з табой.
І зацвітае ля ракі каліна,
І бераг размываецца вадой.
І "Габелен стагоддзя" твой чакае…
Чаго чакае?
Гэта знаеш ты.
З усмешкаю з нябёс ты паглядаеш,
Дзе сонца, як сланечнік залаты.

Настасся НАРЭЙКА

* * *

Прыходзіць заўсёды дакладна
а сёмай гадзіне.
Заказвае каву гарачую. Доўга сядзіць.
І дрыжыкі ціха крадуцца па стомленай
спіне.
Успомніць пра каву. Халодная…
Моташна піць.

Успомніць пра холад у горадзе.
Горад — пакута.
Сівы аксаміт хваравіта звядзе
на грудзях.
І вязаны шалік як сетка, сіло ці павута.
І нешта ўнутры замірае. Ды гэта не страх.

А потым сурвэтку бярэ і асадку хапае
З кішэні. І піша, і піша, і дыхае ледзь.
Маленькія літары.
Фарба блакітна-скупая.
Гадзіннік яе вар'яцее. Так трэба паспець!

Дапіша. Адкінецца. Выдыхне.
Сэрца застыне.
І стане яшчэ халадней.
Трэба кавы глынуць!
Ды кава як бруд у балоціста-шэрай
нізіне.
Не вып'еш да дна.
Ты не зможаш мяне падмануць.
Устане яна, і ў акно шэрай птушкай
заб'ецца,
І выйдзе імкліва, як час.
Падыду да стала.
Сурвэтка ля кубка пустога.
Што мне застаецца?
Вазьму, як абрывак малога,
слабога крыла.

У цішы пакоя свайго
я разгадваю словы
Пры цьмянае лямпе. І цені вакол,
як звяры.
Мне ўсё зразумела. Не трэба ніякай
прадмовы.
«Кахаю. Жыву. Разбураюся толькі
знутры».

Схаваю сурвэтку малую ў старэнькую
кнігу,
Дзе Песняю Песняў падасца
няскончаны верш.
А хто перажыў не-каханне,
нібыта Нямігу,
За келіх разбітага сэрца бярэцца
найперш…
І прыйдзе яна, як заўсёды, а сёмай гадзіне.
Я кнігу пакіну ля кавы на тым жа стале.
І сядзе яна, і спужаецца, позіркам кіне
Па тварах навокал. Чужыя…
Чужыя! Але…

Я сяду насупраць.
Яна не паверыць адразу.
Учэпяцца рукі халодныя ў кнігу маю,
З якое пасыплюць сурвэткі
абрыўкамі часу.
«Я сэрца сваё разам з кнігаю Вам аддаю».

І кава гарачая болей ужо не астыне.
І ў цемры былога патонуць і верад,
і страх.
А кнігу яна выпадкова, як памяць,
пакіне.
А ў горадзе снег.
І карункі на тонкіх плячах…

* * *

Развучылася чакаць.
Я не ўмею.
Мне ніколі не сарваць
Цуд-лілею,
Мне ніколі не ўплясці
Яе ў косы…
Як цябе цяпер знайсці,
Хлопчык босы?

Не магу ужо чакаць.
Ты далёкі.
Як цябе цяпер дагнаць
За тры крокі?
Болей я і не зраблю.
Не здалею.
Кінь на росную зямлю
Цуд-лілею!

Я пабачу, што ты быў
Тут калісьці,
Вось і кветачку згубіў
У свежым лісці.
Забяру яе з сабой,
Каб уночы
Больш не кралі мой спакой
Твае вочы.

Калі ж Бог з'яднае зноў
Нашы лёсы,
Прыбяжыш ты сам дамоў,
Хлопчык босы!

Фота Кастуся Дробава.

* * *

Там да звонкае шыбы,
Расшытае ніткаю белай,
Да ўзору марознага:
Кветкі, сняжынкі і стрэлы —
Так даверліва туліцца
Птушачка-знічка малая,
І ў вочках яе
Спадзяванне святое палае.
Пасыпце ёй семак
Ці смачнага чорнага хлеба.
Гэтай птушцы малой
Вельмі мала для радасці трэба.
Ёй не столькі патрэбная ежа,
Як наша спагада,
Бо любая жывая душа
Будзе вельмі ёй рада.
Уявіце, што гэтая птушка —
Чыёсьці сэрца.
Не шкадуйце цяпла для яе.
Памажыце сагрэцца!

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Любаша

Апавяданне

Паездка гэтая адбылася нечакана-негадана, хоць Павел Вішняк і марыў аб ёй даўно. Асабліва з таго моманту, калі яму пераваліла на восьмы дзясятак. А тут яшчэ цяжкая хвароба, пасля якой… Пра гэта стараўся не думаць, ды нярадасныя згадкі часта напаміналі аб сабе. Захацелася не проста яшчэ раз пабываць у роднай вёсцы, а наведацца ў суседнюю. У ёй, колькі памятае сябе, працавала царква, але, на сорам свой, ён там ніколі не бываў. Аднак хвалявала, як дабрацца. Дзеці, з якімі раней ездзіў на радзіму, даўно завялі сем'і і раз'ехаліся.

І раптам — неспадзяванка. З далёкага горада прыехаў пляменнік. Ды яшчэ на ўласнай машыне. Здзівіла і тое, што завітаў на яго, Паўла Васільевіча, дзень нараджэння. Убачыўшы сваяка, Вішняк не толькі абняў, але і, не саромеючыся, заплакаў. Быў перакананы: супадзенне невыпадковае. Гэта добры знак. Асабліва калі назаўтра пляменнік сказаў тое, чаго ён з такім нецярпеннем чакаў: «Едзем!». Калі выехалі па знаёмай шашы, якую Павел Васільевіч ведаў яшчэ з гадоў студэнцтва, калі наведваўся да бацькоў і вяртаўся назад у Мінск, пляменнік загадкава запытаўся:

— Не толькі царкву хочаш пабачыць?

Ён ведаў, што з гэтай вёскі ў іх восьмы клас хадзіла прыгожанькая дзяўчынка. Пасля перавялася ў іншую школу.

— Калі яна і жывая, — усміхнуўся Вішняк, — то, бадай, гараджанка. І не пазнаеш адно аднаго. Ведаеш, як Аркадзь Куляшоў хацеў пабачыць тую, якая вядомая па песні «Алеся»? Убачыў здалёк і не…

Дагаварыць не паспеў. Нешта вялізнае з усяго размаху стукнула па лабавым шкле. Павел Васільевіч інтуітыўна адхіліўся назад, а пляменнік рэзка націснуў на тармазы. Час быў ранішні, рух на шашы — аднабаковы, спераду і ззаду машыны не ішлі.

— Нічога страшнага, — пляменнік выглядаў спакойным. — Капот нечакана адкрыўся і ўдарыў…

Гэта відаць было па трэшчынах, якія з'явіліся ў многіх месцах.

— Знак! — ужо ўслых прамовіў Вішняк.

…У армію яго прызвалі ў канцы 1960-х. Трапіў у колішнюю Забайкальскую ваенную акругу. Пашанцавала, бо за нейкіх трыццаць кіламетраў ад часці знаходзіўся вялікі горад. Яго, журналіста, гэта радавала. Хутка стаў друкавацца ў мясцовых газетах. Не кажучы пра акруговую «На боевом посту», што выходзіла ў Чыце. Хоць не так часта, як хацелася, бо з'яўляўся камандзірам мотастралковага ўзвода. Перашкаджалі гэтаму і камандзіроўкі.

Вестку аб чарговай сустрэў зусім без энтузіязму. Адпраўляцца на некалькі месяцаў у Якуцію не хацелася. Запэўніванні афіцэраў-саслужыўцаў, што ўдасца яшчэ больш пабачыць свету, не пераконвалі. Ды ў войску як? Загады не абмяркоўваюць, іх выконваюць. Зноў для Вішняка «сваёй» стала Транссібірская магістраль. Толькі калі па павестцы ехаў на пасажырскім поездзе, то цяпер іх вагон прычапілі да грузавога саставу.

З Чыты пачаўся шлях па Якуцка-Амурскай магістралі, бо, вядома, ніякага БАМа яшчэ не было. Ехалі на дапатопных палутарках. Пры пераадольванні чарговага перавала не па сабе станавілася. Тармазы амаль не працавалі. Калі што здарыцца, не толькі вадзіцель будзе вінаваты. Адказнасць нясе і лейтэнант як старэйшы машыны.

Аднак калі ж дасягнулі Тынды, настрой узняўся. Зразумела, палутаркі засталіся тыя самыя, але за ёй пачыналася Якуція. Зайшоўшы ў краму, убачылі бляшанкі тушонкі, якой нідзе і ў паміне не было. Поруч разнастайныя прадукты, далікатэсныя віны — вочы разбягаюцца. Ды і каньякі па нейкія чатыры рублі.

Прадаўшчыца патлумачыла:

— У Якуціі — спецыяльнае забеспячэнне.

У гэтым неаднойчы пераконваліся, разбіўшы свой лагер у ляску за некалькі метраў ад магістралі. Наперадзе знаходзіўся пасёлак Залацінка, а калі вяртацца назад — Нагорны. Да яго далей, але тавараў больш. У Нагорны часцей і наведваліся. Спадарожнага транспарту ставала ў абодва бакі. Фуры ахвотна спыняліся, бо вадзіцелю ў радасць мець спадарожніка. Ездзілі не толькі афіцэры, але і салдаты. Ніякай субардынацыі, галоўнае, каб не на шкоду працы.

Яна ж была своеасаблівая. Ад Ледавітага акіяна па Якуціі да Амурскай вобласці, а пасля па Транссібірскай магістралі да Масквы пад зямлёй ішоў нейкі важны стратэгічны кабель. У некаторых месцах маланкі часта пашкоджвалі яго. Давялося адкопваць і зверху класці медны провад. З-за рознага супраціўлення маланка трапляла ў яго, а не ў асноўны.

Салдаты звычайна спраўляліся за паўдня. Астатні час былі вольныя. Праўда, не сказаць, каб было надта весела. Некаторыя ўзялі з сабой радыёпрыёмнікі, але ніводную станцыю яны не бралі. Калі ўключалі, у эфіры толькі чуўся шум.

Затое радавала прырода. На першы погляд і нейкая нягеглая. Ледзь не карлікавыя бярозкі, кусты кедрача, якія навыперадкі стараліся цягнуцца да сонца. Больш высакаватыя сосны. Затое настрой уздымаў ні з чым не параўнальны пах нерушавай свежасці. А на пачатку жніўня на высокіх месцах з'явілася шмат дурніц, агрэсту. Летам з задавальненнем можна было паплюхацца ў невялікай рачулцы.

Асабліва Вішняк любіў наведваць Нагорны, хоць дзеля піва дабіраўся і да Чульмана. Нейкія семдзесят кіламетраў — хіба гэта адлегласць для Якуціі! У Нагорным і пазнаёміўся з дзяўчынкай Любай, якая стала для яго Любашай. Як гэта адбылося, даўно запамятаў. Што не адразу па прыездзе — дакладна. Усё ж розніца ва ўзросце была вялікая — шаснаццаць гадоў. Вучылася яна ў педагагічным вучылішчы ў Якуцку, цяпер была на канікулах. Маці яе была ўкраінка, бацька — армянін.

Ён нібыта ўзначальваў нейкі дарожны ўчастак, пры якім была гасцініца, дзе начавалі шафёры, якіх ноч заспела ў Нагорным. Начаваў часам і Вішняк, калі дапазна затрымліваўся з Любашай. Ранкам з кім-небудзь з гэтых шафёраў і дабіраўся да свайго лагера. Часам праз сон чуў, калі нехта з насельнікаў пытаўся, а што гэта за лейтэнант начуе.

— Будучы зяць Азарана, — чулася ў адказ.

Калі ў канцы жніўня развітваліся — яна ад'язджала на вучобу, перажываў. Разумеў, што гэтая ростань назаўсёды. Як жа здзівіўся, калі Любашу сустрэў у Нагорным. Аказалася — каму няшчасце, каму — шчасце. Высветлілася, што ў яе нейкія непаладкі з вучобай. Не падумаўшы, пажартаваў:

— Вазьму да сябе, з салдатамі будзеш працаваць.

Давялося прасіць прабачэння. Сустракаліся да таго дня, калі яму прыйшоў час вяртацца ў часць. Нічога не абяцаў. Яна і разумела, якія могуць быць абяцанкі. Ён таксама быў упэўнены, што гэтае развітанне назаўсёды. Не сумняваўся, што хутка выкрасліць яе са свайго сэрца.

Памыліўся… Атрымалася, як з той стрэмкай у пальцы. Даўно няма, а тое месца часам баліць. Часта ўспамінаючы яе, лістоў, аднак, не слаў. Выйсце знайшоў у тэлефанаванні, хоць і разумеў, што іх размовы будуць чуць многія. Аўтаматычная тэлефонная сувязь тады, як вядома, існавала толькі ў вялікіх населеных пунктах. Размову з абанентам можно было заказаць загадзя. Але для гэтага патрабаваўся немалы час. Яго ў Вішняка па прыездзе са сваёй часці ў горад было ў абрэз.

Усё ж выйсце знайшоў. Тлумачыў тэлефаністкам, што і да чаго. Калі быў у вайсковай форме, згаджаліся хутчэй. Праўда, папярэджваў, што ад пасялковай пошты да абанента не адна сотня метраў. Ды запэўніванне: «Гэты час аплачу!» дзейнічала. Можна сабе ўявіць, з якой цікавасцю яны слухалі яго размову з Любашай. Расплаціўшыся, стараўся хутчэй знікнуць, каб не сустракацца з цікаўнымі позіркамі.

…Пра гэтую яго камандзіроўку ў Якуцію пляменнік добра ведаў. Пра яе і ўвогуле пра службу ў войску ён расказваў не толькі сваім дзецям, але і яму. Таму, пачуўшы «Знак!», пляменнік пацікавіўся.

— Які яшчэ «знак»?

— Пазней раскажу…

Паездку паўтарылі назаўтра. Спачатку наведалі вёску, у якой знаходзілася царква. На жаль, у яе не зайшлі, бо была на рамонце. Потым заехалі ў суседнюю, дзе Павел Васільевіч заканчваў сярэднюю школу. Дома, у якім некалі жылі бацькі, даўно не было. Як і некаторых іншых. Ад усведамлення гэтага стала так сумна, што амаль усю дарогу назад маўчаў. Разумеючы яго стан, маўчаў і пляменнік.

Дома Вішняк адшукаў альбом, у якім захоўваў даўнія здымкі. Найчасцей з гадоў юнацтва. Не так і шмат іх было, бо фатаграфавацца не любіў. А зробленыя нядаўна захоўваліся ў камп'ютары. Асобныя ў лічбавы фармат перавяла жонка, некаторыя — дзеці. Толькі больш любіў разглядаць альбомныя, што нагадвалі аб тых далёкіх гадах, якія ніколі не вярнуць. Без цяжкасці адшукаў і гэты, зроблены каля пасёлка Нагорны.

Жартаўлівы: лейтэнант Вішняк з кавенькай у руках, з расшпіленым каўняром гімнасцёркі ледзь перастаўляе ногі, а за яго спінай відаць дарожны слуп. На ім указана, што адсюль да Якуцка 895 кіламетраў, да Алдана — 362, а да Чульмана — усяго 116. Гэта адзін з яго армейскіх сяброў прапанаваў так увекавечыць сваё знаходжанне ў Якуціі. Маўляў, глядзі, захапляйся, якія мы з табой адлегласці пераадольвалі!

Гэты здымак, як ніколі раней, выклікаў у яго душы трапяткое хваляванне. Вочы міжвольна завалакла павалока, а паколькі Павел Васільевіч у пакоі быў адзін, не саромеючыся, заплакаў. У гэтых слязах была і радасць даўняга, і роспач сённяшняга. Прысутнічала і трывога аб далейшай няпэўнасці. Тое, што аварыя на дарозе не прывяла ні да чаго страшнага, безумоўна, усяляла ўпэўненасць, што ёсць каму пра цябе клапаціцца. Астатняе…

Ён не ведаў, як дакладней гэта сказаць. Якое слова ні падбяры — будзе праўдзівым, бо за ўсім згаданым схавана тое, што назаўсёды прайшло. Але асабліва балюча, што нейкім чынам тычылася і яго біяграфіі. Не па сабе станавілася, як даведаўся з інтэрнэту, што пасёлка Нагорны ўжо няма. Знік, быццам ніколі і не існаваў, а Залацінка разраслася, стала раённым цэнтрам. Сапраўды ўжо — кожнаму сваё. І паселішчам, і людзям. Першыя з іх знікаюць бясследна, аб людзях застаюцца толькі памяць, воблікі іх і здымкі.

Любашу ён памятае, а вось ніводнага здымка дзяўчыны не мае. Затое яе сястры з мужам-лейтэнантам, які служыў у тых мясцінах, дзе Вішняк пабываў, ёсць. Не засталося і ніводнага ліста яе, хоць памятае, што ў адным з роспаччу пісала: «Я здагадвалася, што ты жанаты».

Жаніўся ён не проста позна, а вельмі позна. Ды, па праўдзе кажучы, ніколі і не ўяўляў яе сваёй жонкай. Тады што гэта было? Можа, у нечым праявілася тое, пра што Іван Бунін расказаў у апавяданні «Солнечный удар»? Але на той час Вішняк гэтага твора не чытаў. Ды і сітуацыя ў яго была іншая.

Разумеў, што сёння гэта не так і істотна. Добра, што не адбылося аварыі. Як і тое, што з'явіліся згадкі, якія прымусілі яго вярнуцца спачатку ў маленства, а потым у юнацтва. Толькі на першы погляд тут ніякай сувязі. За гэтым, ён ніколькі не сумняваўся, той знак Усявышняга, які ён і меў на ўвазе. Сам Гасподзь яму напамінаў: глыбока памыляецца той, хто мяркуе, што ў чалавеку ўсё залежыць толькі ад яго самога. Як і забывае, што ў кожным з нас мінулае і сённяшняе павязаны. Нават у тым, што на першы погляд падаецца дробязным.

З-за таго, што Любаша нечакана табе прыгадалася, ты перажыў хвіліны, якія ніколі не можаш забыць. Магчыма, тадышныя сустрэчы з ёю ў нечым былі і наіўнымі. Як быццам, і не вяжуцца з паводзінамі 24-гадовага лейтэнанта. Але яны былі, і добра, што ты па-ранейшаму не выключаеш іх са сваёй памяці. Ведаеш, што ўсё гэта — тваё жыццё. Толькі памятай: не табой прыдуманае, як і шмат што іншае. Забудзь сумнае і горкае. Старайся забыць, у чым звінавацілася перад табой колішнія твае сябры. Не зважай увагі на тых, хто працягвае рабіць табе прыкрасці. Ты ж жывеш. І радуйся гэтаму, а Я буду спрыяць табе.

Падышоўшы да акна, Вішняк убачыў свайго добрага знаёмца. Клён, які колісь, калі Пятро пасяліўся ў гэтым доме, быў зусім маладзенькі. Цяпер ён не толькі разросся, але крыху і нахіліўся. З кожным годам усё больш і больш схіляецца долу, але не здаецца. На яго галінках ужо і цяпер, калі восень толькі пачылася, праступаюць жоўтыя прожылкі. Але не здаецца, пад лёгкім ветрыкам пакалыхваецца. Быццам нагадвае: жыву.

«І я буду жыць!» — падумаў Вішняк.

Інтуіцыя падказала...

Нядаўна ў Мінску ў Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы прэзентаваў новую кнігу расійскі пісьменнік Аляксандр Руж. Арганізавала творчы вечар выдавецтва «Чатыры чвэрці», якое і выпусціла ў свет першую ў Беларусі кнігу аўтара пад назвай «Прывід Заратустры». Перад сустрэчай з новай для Аляксандра Ружа аўдыторыяй пагутарылі пра творы ды іх чытача.

Аляксандр Руж.

— Аляксандр Сяргеевіч, як часта бываеце ў Беларусі?

— Апошнім часам прыкладна раз на год — у нас з жонкай тут сваякі. Але па літаратурных справах, тым больш як афіцыйная асоба — прадстаўнік Саюза пісьменнікаў Расіі, яго мурманскай арганізацыі, — я тут упершыню. Апроч іншага, гэтым разам сустрэўся са старшынёй Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесем Карлюкевічам: гутарылі пра міжнародныя сувязі, абмяркоўвалі пытанне абмену дэлегацыямі. Наогул, знайшлі кропкі судакранання. Калі абставіны складуцца спрыяльна, ужо ў наступным годзе дэлегацыя мурманскіх пісьменнікаў прыедзе ў Беларусь. З візітам у адказ чакаем беларускіх аўтараў.

— Галоўная падзея для вас, напэўна, — прэзентацыя першай кнігі, выдадзенай у Беларусі, «Прывід Заратустры»?

— Увогуле, гэта мая першая кніга, выдадзеная за мяжой. Няхай гэта найбліжэйшае замежжа, тым не менш дагэтуль мае творы друкаваліся толькі ў Расіі. Так, выйшла 37 маіх кніг у розных выдавецтвах.

— Як вырашаеце, з якім выдавецтвам супрацоўнічаць?

— Для мяне даўно няма праблем выдаць кнігу, таму магу выбіраць. Найперш улічваю, з кім працаваць будзе камфортна. У Расіі супрацоўнічаў з добрым дзясяткам выдавецтваў — ад рэгіянальных мурманскіх да найбольш буйных у краіне, як «Эксмо» і «АСТ». Па-другое, падабаецца, калі кніга зроблена з душой. Натуральна, вельмі прыемна працаваць там, дзе да аўтара індывідуальны падыход. Даўно прыглядаўся да беларускіх выдавецтваў. Пазнаёміўшыся з некаторымі з іх, выбраў «Чатыры чвэрці». Выдавецтва спадабалася, нешта адгукнулася ў душы… Між тым яшчэ не быў знаёмы з Ліліянай Фёдараўнай (дырэктар выдавецтва «Чатыры чвэрці». — **Я. Ш.**), усё вывучаў праз інтэрнэт, але інтуіцыя падказала: тут кнігу зробяць добра. Не памыліўся.

— Якая была мэта выдання кнігі ў Беларусі?

— Проста прыйшла думка: чаму не? Навошта сябе абмяжоўваць расійскімі выдавецтвамі? Краіна для мяне не чужая. Да таго ж тут шмат рускамоўных чытачоў. Было цікава адкрыць для сябе новы сегмент аўдыторыі. Зазіраю туды, куды яшчэ не зазіраў, таму крышачку страшна. Спадзяюся, прымуць добра.

— Між тым расійская аўдыторыя павінна быць вам добра знаёмая. Як часта ладзіце творчыя сустрэчы?

— Імкнуся часта, асабліва ў сваім рэгіёне. Рэгулярна выступаю ў розных кутках краіны, напрыклад, на фестывалі «Красная площа» ў Маскве. Гэта ўнікальная магчымасць паразмаўляць з самымі рознымі чытачамі, у тым ліку з іншых краін. Са здзіўленнем даведаўся, што маю чытачоў у Сібіры, на Далёкім Усходзе… Дарэчы, у перыяд пандэміі выдавецтва «Эксмо» арганізоўвала тэлемосты праз інтэрнэт; так, былі сустрэчы з аўтарамі, і падключалася публіка з Беларусі. Даведаўся, што маё імя чулі і тут.

— Якім вам уяўляецца ваш чытач?

— Добрую кнігу прачытае чытач незалежна ад полу, узросту, прафесіі… Між тым імкнуся пісаць творы, разлічаныя на розную публіку. У мяне ёсць, напрыклад, дзіцячыя раманы і паэтычныя зборнікі. Спрабую свае сілы ў розных жанрах, імкнуся быць цікавым для любога чытача. Няхай гэта эксперымент, але мне нецікава было б пісаць усё жыццё толькі фантастыку, ці дэтэктывы, ці вершы.

— Ці можна сцвярджаць, што дэтэктыў — улюбёны жанр?

— Не сказаў бы, хоць колькасць напісаных мной дэтэктываў сведчыць пра адваротнае.

— А над чым працаваць складаней?

— Па інтэнсіўнасці выдаткаваных сіл ёсць адрозненні. На маю думку, пісаць прозу і пісаць вершы — вялікая розніца. Проза — гэта выключна праца, яе калінікалі неабходна прымусіць сябе рабіць. Ёсць нават норма па колькасці знакаў у дзень. А вершы з-пад палкі не напішаш, неабходна, як казаў Восіп Мандэльштам, «погудка». Шмат часу ідзе на абдумванне.

— Мабыць, часта даводзіцца выбіраць?

— Натуральна. Аднойчы давялося нават змяніць лад жыцця. Я журналіст, скончыў Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт, працаваў на радыё, у газеце, аднак літаратура займала ўсё болей і болей часу. Зразумеў: адно з адным аб'яднаць немагчыма, тым больш што літаратура мяне заўсёды больш цікавіла. З 2011 года жыву выключна гэтай працай — пішу кнігі і сцэнарыі для фільмаў.

— Ці ўдаецца зарабляць?

— Так, але неабходна вельмі напружана ствараць. Здаецца, афіцыйна беспрацоўны, але працаваць стаў нашмат болей.

— Некаторыя вашы кнігі, у тым ліку аўдыякнігі на платформе «Литрес», пазначаюцца за аўтарствам Аляксандра Ружа. На іншых вокладках сустракаецца ваша сапраўднае прозвішча Рыжоў. Чаму так?

— Псеўданім некалі прыдумалі выдаўцы ў «Эксмо». У іх, зразумела, свой погляд на справу, і на маркетынг у тым ліку. Я пагадзіўся і даверыўся ім. Між іншым, на платформе «*LiveLib*» наогул існуюць два мае профілі — Аляксандр Рыжоў і Аляксандр Руж. Нехта палічыў, што гэта розныя людзі. Дагэтуль фотаздымак на адной са старонак чужы. Такое раздваенне, прызнаюся, забаўляе.

— Немагчыма не спытаць: а беларускай літаратурай калі-небудзь цікавіліся?

— Соромна, але сучасную беларускую літаратуру ведаю дрэнна. Аднак беларускія класікі мне блізкія. У свой час удалося пазнаёміцца з творамі многіх беларускіх аўтараў, праўда, у перакладзе на рускую мову. Хочацца пазнаёміцца з сучаснікамі. Тым больш што з'явілася выдатная магчымасць — мне падарылі камплект кніг сучасных аўтараў.

— Ці разглядаеце магчымасць перакладчыцкай дзейнасці?

— Узнікла ідэя перакласці беларускую паэзію з арыгінала на рускую мову. Мабыць, крыху самаўпэўнена... Зразумела, трэба пачынаць з нечага болей простага. Але жаданне ёсць, як і вопыт перакладу з падрадкоўніка, бо арыгінал быў на складанай мове — саамскай. Што тычыцца беларускамоўных вершаў, пастараўся б перакласці, не карыстаючыся падрадкоўнікам. З дзяцінства, дзякуючы пераплеценым радавым караням, свабодна чытаю па-руску і па-ўкраінску. А беларуская мова недзе побач.

— У большасці сваіх кніг, як і ў творы «Прывід Заратустры», вы вяртаецеся ў мінулае. Навошта вам гэта?

— Мне падабаецца капацца ў гісторыі. Амаль усё, пра што пішу, мае тое ці іншае дачыненне да гісторыі. Цікавяць самыя розныя эпохі, непакоіць усё, што звязана з мінулым маёй краіны і ўсяго свету.

— У новай кнізе дзеянне адбываецца ў 1927 годзе. Чаму менавіта ён?

— У творы хапае выдумкі, але маецца пэўная аснова. У 1920-я гады пры АГПУ існаваў спецыяльны аддзел, якім кіраваў Глеб Іванавіч Бокій, цікавая і неадназначная асоба. Між тым пры аддзеле была асобая група, на чале якой стаяў чалавек, які заслугоўвае асобнага рамана, — Аляксандр Васільевіч Барчанка. Пра яго сёння амаль ніхто не ведае, і адназначна выказацца наконт гэтай асобы таксама даволі складана.

— Што вы маеце на ўвазе?

— Сёння яго б назвалі акультыстам, містыкам — яшчэ да рэвалюцыі займаўся вывучэннем таго, што сучаснікі называюць паранармальнымі з'явамі. Дарэчы, пісаў кнігі. Адзінае сёння выданне яго твораў з'явілася ў 1991 годзе. Здавалася б, што пасля рэвалюцыі такому чалавеку не павінна было знайсціся месца ў савецкай дзяржаве. Але Аляксандр Барчанка жыў, працаваў, нават займаў пост кіраўніка асобай групы пры АГПУ, якая працягвала вывучаць паранармальныя з'явы. Напрыклад, з Запаляр'я ён прывозіў шаманаў, спрабаваў вывучаць магчымасці тэлепатыі… Вар'яцтва, з нашага пункта гледжання, але на даследаванні выдзяляліся дзяржаўныя грошы. А гэта найскладанейшыя 1920-я…

— Гэта і паслужыла штуршком для напісання кнігі?

— Некалі натрапіў на інфармацыю, што Барчанка арганізаваў экспедыцыю на кольскую поўнач. У гэтых мясцінах я і жыву, таму было надзвычай цікава пра гэта дазнацца. На аснове нешматлікіх матэрыялаў, што засталіся пасля экспедыцыі, і з дапамогай уласнай фантазіі я напісаў раман «Кліч палярнай зоркі». У гэтым творы ўпершыню з'явіўся герой Вадзім Арсеннеў, адзін з памочнікаў Барчанкі. Мне здалося, што матэрыялу дастаткова, каб напісаць пра гэтую асобу яшчэ нешта. Кніга «Прывід Заратустры» якраз расказвае пра адну з прыгод Вадзіма Арсеннева. Тут дзеянне адбываецца ў Туркестане…

— Чытачу, відаць, будзе складана адрозніць праўду ад выдумкі…

— У гэтым і прывабнасць!

Яўгенія ШЫЦЬКА

Фота даслана выдавецтвам «Чатыры чвэрці»

Сумленне і лёс

Прэзентацыя кнігі «Дараванне» — першай з серыі «Сучасная беларуская літаратура» выдавецтва «Аверсэв» — адбылася ў Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага і стала часткай маштабнага культурна-асветніцкага праекта «Праз кнігу да міру і стварэння».

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, складальнік серыі Алесь Карлюкевіч і аўтары зборніка «Дараванне» Алена Брава і Анатоль Бензярук са студэнтамі, выкладчыкамі, літаратарамі абмеркавалі мастацкія вартасці твораў сучасных пісьменнікаў.

Алесь Карлюкевіч расказаў пра канцэпцыю адбору аповесцей і апавяданняў у серыю кніг. Згодна з задумкай, серыя будзе складацца з 12 зборнікаў. Але, па меркаванні складальніка, колькасць выдадзеных кніг можа і павялічыцца — усё залежыць ад чытацкага попыту і цікавасці да сучаснай літаратуры. Прадстаўленыя творы ўжо атрымалі ацэнку ад крытыкаў і аматараў літаратуры, бо публікаваліся ў вядучых перыядычных выданнях на працягу апошніх гадоў.

Так, аповесць «Дараванне» Алены Брава ўпершыню пабачыла свет у часопісе «Маладосць» у 2011 годзе, была перакладзена на нямецкую і рускую мовы, а Міжнародная асацыяцыя пісьменнікаў-баталістаў і марыністаў Масквы адзначыла твор літаратурнай прэміяй імя Канстанціна Сіманава. У 2013 годзе «Дараванне» выдадзена на трох мовах асобнай кніжкай. Падчас сустрэчы пісьменніца разважала на тэму сямейных каштоўнасцей, чалавечага сумлення і лёсу.

Анатоль Бензярук расказаў, як сумяшчае пісьменніцкую працу з журналісцкай, выказаў свой погляд на жыццё, але прызнаўся, што ў большай ступені адчувае сябе гісторыкам. Пісьменнік расказаў пра складаную працу над дакументальнай аповесцю «Галавасек», у якой занатаваны жудасныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны і лёс спаленай вёскі Драмлёва. Дарэчы, кніга ў хуткім часе пабачыць свет.

Роздумамі наконт шматзначнага сэнсу назвы кнігі «Дараванне» падзялілася кандыдат педагагічных навук, прафесар кафедры лінгвістычных дысцыплін і міжкультурных камунікацый БрДТУ Марыя Жыгалава, а дацэнт кафедры беларускай філалогіі БрДУ імя А. С. Пушкіна, кандыдат філалагічных навук Святлана Шчэрба адзначыла асаблівасць аповесцей і выказала пісьменнікам удзячнасць за тое, што яны закранаюць актуальныя праблемы. Спецыяліст па сувязях з грамдскасцю выдавецтва «Аверсэв» Павел Махінаў распавёў пра мастацкую задумку ў афармленні кніг. На вокладцы кожнага выдання змешчаны рэпрадукцыі карцін са збора



Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Зборнік «Дараванне» ўпрыгожыла рэпрадукцыя карціны Зоі Літвінавай «Вяртанне з храма» (1989).

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ

Чараўніцтва аднаго тандэму

Сапраўдным даведнікам для дзяцей хочацца назваць дзявятую кнігу з серыі «Наша дружная сям'я» наваполацкай паэтэсы Ірыны Багданавай. Кніга ў перакладзе на беларускую мову Надзеі Салодкай, аздобленая мастачкай Ірынай Барадуль, выйшла ў свет у 2022 годзе ў Полацкім кніжным выдавецтве. На тытульным лісце пад назваю пазначана: «Пра ўсё і пра ўсіх: выбраныя вершыкі для дзяцей». Зачапіла, кранула ласкавае слова «вершыкі»! Сапраўды, вершыкі: чатырохрадкоўі, зрэдку шасцірадкоўі — закончаныя, ёмістыя па змесце творы, выбраныя з папярэдніх рускамоўных кніг згаданай серыі, якія аўтарка палічыла неабходным змясціць у перакладную кнігу, бо яны маюць самастойнае значэнне і гучанне.

Удалая, трапная назва кнігі — «Разважалкі». Дзіця разважае… Што можа быць больш важным для станаўлення пакуль яшчэ маленькага чалавека! Паэтэса вымушае гэтую малечу думаць і разважаць. І вельмі важна, каб да яго як мага раней трапіла такая патрэбная кніга.

Малы аб'ём твораў тлумачыцца тым, што дзятве так больш зручна чытаць, слухаць і запамінаць, разважаць «пра ўсё і пра ўсіх». Вершы размешчаны па раздзелах з цікавымі назвамі: «На пытанні ёсць адказы», «Веды ў школе набываю», «Так ідзе ад года ў год», «Марыць — карысна», «Дні тыдня», «Пра святы» і інш. Так і ўяўляецца, як дзяўчынка ці хлопчык, раскрыўшы кніжку, пільна ўглядаюцца ў малюнкі, гартаюць старонкі, мацаючы пальчыкамі прыемныя на дотык шаўкавістыя аркушы (добрая папера, цвёрдая вокладка), і пачынаюць учытвацца ў радкі, усё больш паглыбляючыся ў змест і асэнсоўваючы яго. Спахопліваюцца: дык гэта ж пра мяне, пра маіх маму, тату, дзядулю з бабуляю, пра маю сяброўку! І вось ужо чалавек разважае, думае, адкладзе кнігу, зноў возьме… Не хочацца расставацца з ёю.

Чырвонай ніткаю праз усю творчасць Ірыны Багданавай праходзіць думка аб важнасці сям'і. У гэтай кнізе — таксама, сведчанне — тры першыя раздзелы: «Наша дружная сямі'я», «Пра маці і бацьку», «Пра бабулю і дзядулю». Тым самым пісьменніца дапамагае дзецям з маленства засвоіць неацэнную вартасць сямейных каштоўнасцей:

Я кажу пры ўсім народзе,
Што мы ўсе жывём у згодзе:
Татка, мама, кот і я —
Вельмі дружная сям'я!

Кніга дае штуршок не толькі фантазіі, а навучае карысным рэчам: інтэрнэтам трэба карыстацца з розумам, і тады гэта будзе дабро.

Я мяркую вельмі шчыра:
Межы інтэрнэт пашырыў
І для вока, і для вуха.
Ён — як бабчын ёмкі куфар:
Варта ключык падабраць,
Што заўгодна можна ўзяць!

У раздзеле «Веды ў школе набываю» — пра тое, як цікавасць да ведаў дапамагае вучыцца, добра паспяваць па ўсіх прадметах.

Лічбы, лічбы… не дакука,
Матэматыка — навука,
Як дзяліць і прыбаўляць.
Памнажаць і адымаць!

Вершы Ірыны Андрэеўны неўпрыкметку, а дзе і напрамую выхоўваюць маленькіх чытачоў, асабліва ў раздзеле «Пра добры і дрэнны настрой».

Для харошага настрою
На дабро сябе настрою,
Каб была ва ўсім удача, —
Толькі так і не іначай!

Дзякуючы раздзелу «Пра культуру паводзінаў і мовы» дзіця абавязкова, нават міжволі, запомніць выразы: «Грубасць вельмі абражае, // Слова добрае зблі-

жае!», «Як няма чаго казаць, // Дык не сорамна змаўчаць!»

Працягваючы ненавязлівы выхаваўчы працэс, Ірына Багданава прапануе дзецям, як паводзіць сябе, і ў вершах раздзела «Калі я сустрэну…» Тут маляўніча абыгрываецца стаўленне да розных чалавечых пачуццяў і адчуванняў: радасці, хвалявання, сораму, сярдзітасці, удзячнасці, грубасці, дурноты, стомы і інш.:

Сутыкнуўшыся з дабром,
Я вазьму яго ў свой дом,
Пакладу на ложак спаць,
Буду песні напяваць:
Хай яму салодка спіцца,
Хай дабру дабро прысніцца!

Кнігу можна бясконца цытаваць і цытаваць. Вершы Ірыны Багданавай вельмі падабаюцца дзецям. Пацвярджэнне гэтаму — рэакцыя дзіцячай аўдыторыі на яе творы падчас выступленняў у школе ці ў дзіцячым садку: гучныя дружныя апладысменты, зацікаўленыя вочы, безліч пытанняў, няўрымслівае шчырае жаданне самім дэкламаваць вершы — наперабой, з задавальненнем, ахвотна… Паэтэса добра ведае, адчувае псіхалогію дзіцяці, разумее яго свет і патрэбу, бо мае сваіх дзвюх унучак, і яны — гераіні многіх яе вершаў і маляўнічых сюжэтаў. Яна піша ад імя дзіцяці і валодае дарам пераўвасабляцца ў сваіх маленькіх герояў. Усё гэта ў спалучэнні з паэтычным талентам, адукаванасцю, камунікабельнасцю дае такі шыкоўны вынік. Дзеці любяць, разумеюць і хочуць чытаць і ведаць яе вершы, мець кніжкі ва ўласнай хатняй бібліятэцы. І якая ж радасць на іх тварыках, калі яны атрымліваюць тую кніжку ў падарунак ад аўтара! Самае галоўнае — у іх нараджаецца цікавасць да літаратуры, чытання, увогуле кніг.

Стварыць пазнавальную і павучальную цудоўную кніжку «Разважалкі» дапамагла Надзея Салодкая. І тут адразу трэба адзначыць майстэрства перакладу. Пераклад «Разважалак» зроблены дакладна, амаль падрадкоўнік, тут строга вывераная аўтарская паэтычная магія, бо погляды на матэрыял, адчуванні аўтара і перакладчыка супадаюць поўнасцю. Два таленавітыя чалавекі стварылі цудоўную кнігу.

Яшчэ варта нагадаць іх удалую папярэднюю сумесную працу — кніжкі-«блізняткі» «Кто бы что ни говорил» і «Хто б пра што ні гаварыў». Вось тут і разумееш, што лепшага і больш цікавага творчага тандэму не знайсці.

Нельга абысці ўвагай працу кнігай мастачкі Ірыны Барадуль. Сімпатычныя і выразныя тварыкі і рухі герояў вершыкаў пададзены ёю надта ўдала і арыгінальна.

Ірына Багданава правяла ўжо шмат прэзентацый у бібліятэках, школах і установах дадатковай адукацыі Полацка, Наваполацка і Полацкага раёна і не толькі, кніжка разыходзіцца па ўсёй Беларусі. Дзеці шукалі яе выданні, вучылі вершы напамяць, выступалі з імі на конкурсах. Менавіта такая літаратура запатрабавана ў наш час. Літаратура, якая выхоўвае дзяцей з маленства, прывучае чытаць, паважаць кнігу, думаць, разважаць…

Валянціна СОПІКАВА

З рэдакцыйнай пошты

Паўлік супраць Чыпірадлы-задзірадлы

У адной з мінскіх кнігарань (калі трапляю ў іх, то надоўга, наколькі дазваляюць час і грошы) пачуў, як маці дае параду юнаму пакупніку кніг: «Не чапай гэтую кніжку, там вершы, я глядзела, ні аб чым…» Крыўдна мне стала за беларускую паэзію для дзяцей. Далей не прыслухоўваўся, але згадаў, што многія кнігі вершаў для дзяцей былі часткай майго чытання ў дзяцінстве. Вершы і рускіх, і беларускіх паэтаў — Васіля Віткі, Васіля Зуёнка, Алега Лойкі, Рыгора Барадуліна…

Вярнуўшыся дахаты, пачаў на паліцах хатняга кнігазбору (а ён у мяне немалы) шукаць дзіцячыя кнігі. Некаторыя з іх не параўнаць з сённяшнімі маляўнічымі выданнямі. І раптоўна натрапіў на невялікага памеру кніжачку вершаў

«Паўлік кніжачку чытае» Галіны Дашкевіч. Прызнаюся, аўтар мне невядомы. Іншых кніг Галіны Дашкевіч не чытаў. І нават, на свой сорам, забыўся, калі, дзе, з якой нагоды набыў гэты зборнік.

Захапілі малюнкі, якія да кнігі зрабіла Г. С. Хінка-Янушкевіч. Кніга, дарэчы, выдадзена ў мінскім выдавецтве «Юнацтва», якое даўно ўжо не існуе. «Коцік Кузя не мурлыча, // Песень-баек не спявае, // Мышак да сябе не кліча. // З непакоем пазірае, // Каб ніхто не перашкодзіў, // Каб у доме не нашкодзіў. // Справа важная такая — // Паўлік кніжачаку чытае…» Так з першага верша і прачытаў я ўсю кнігу паважанай Галіны Дашкевіч. Творы захапляюць, прыцягваюць. Шкада, што побач са мною не было нікога з малых дзетак, бо такія вершы трэба чытаць услых.

Адзін з твораў — па жанры, пэўна, вершаваная казка ці вершаванае апавяданне — уразіў асабліва. Гэты твор — «Пра Чыпірадлу-задзірадлу». Вось пачатак: «Чыпірадла-задзірадла // Закруціўся ў прасціралда // І пайшоў скакаць па хаце… // Напужаў сястрычку, маці, // Кнігі ўсе параскідаў, // Сшыткі ўсе павымятаў. // З'еў варэнне і пячэнне // І крычыць: "Далоў мучэнне! // Раз гуляць, дык і круціцца, // Не жадаю я вучыцца. Надакучыла навука!"» З такога пачатку выйшаў сапраўдны спектакль, гульня пачалася самая што ні ёсць сур'ёзная… Не адразу было і зразумела, што Чыпірадла-задзірадла — гэта звычайны хлопчык… Праўда, нейкі бунт супраць школы, вучэння ён збіраецца ладзіць. Не буду далей пераказваць займальны і павучальны тэкст. Перад вачыма Чыпірадлы-задзірадлы паўстае сівы дзядок, які запрашае хлопчыка ў далёкае падарожжа, «дзе ні двоек, ні дзяцей», туды, дзе пануе, гаспадарыць Дуралей, які ненавідзіць работу. Але такія змрочныя перспектывы дзядок перад хлапчанём вымалёўвае, што ў дзіцяці перамагае розум, перамагаюць яго паслухмянасць і стараннасць. І ўжо «Наш герой у школу ходзіць, // Воч з падручніка не зводзіць, // Перастаў быць Чыпірадлам…» І ў выніку ён — найлепшы вучань школы…

Дзякуй Галіне Дашкевіч за такі выключна важны для выхавання малых чытачоў твор. Вось бы якое з выдавецтваў перавыдала і яе зборнік вершаў «Паўлік кніжачку чытае», і іншыя даўно забытыя кнігі з добрымі вершамі для дзяцей!.. Мо тады і не было б дыялогаў маці з дзіцем, падобных таму, які я пачуў у мінскай кнігарні.

Валерый ПАНАСЮК,
г. п. Карэлічы,

Чароўная прастора зямнога

Да 26 лістапада ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў (пр-т Незалежнасці, 47) працуе выстаўка па выніках Рэспубліканскага конкурсу «Нацыянальная прэмія ў галіне выяўленчага мастацтва». Мэта праекта, арганізаванага Міністэрствам культуры, Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў, Беларускім саюзам мастакоў і, натуральна, цэнтрам сучасных мастацтваў, — прадэманстраваць дасягненні беларускага выяўленчага мастацтва за апошнія некалькі гадоў.

На выстаўцы прадстаўлены творы аўтараў, якія не маюць патрэбы ў прадстаўленні. Гэта Іван Міско, Сяргей Гумілеўскі, Максім Пятруль,

Наталля Лісоўская «Сенажаць», 2021 г.

Андрэй Вараб'ёў «Нараджэнне, жыццё, смерць і жыццё пасля смерці Андрэя Вараб'ёва», 2021 г.

Аляксандр Шапо, Андрэй Вараб'ёў, Глеб Отчык, Усевалад Швайба, Уладзімір Уродніч, Мікалай Апіёк, Ганна Конанава і многія іншыя. У іх работах адлюстраваны погляд на мінулае краіны і яе сённяшняе становішча, захавана імкненне аўтараў быць цікавымі не толькі сучасніку, але і нашчадку. На такі дыялог спадзяюцца і прадстаўнікі больш маладога пакалення, напрыклад, Фёдар Шурмялёў, Таццяна Савік, Ганна Садоўская…

Аднак такія выстаўкі могуць і адштурхнуць. Чым? Як правіла, адсутнасцю канцэпцыі. Гледачу прапаноўваюць вылучанае кімсьці (у дадзеным выпадку прафесіяналамі, журы) як найяскравейшае, самае адметнае і найбольш важнае для айчыннага мастацтва. І вось яго пужаюць гэтай выбранасцю, а таксама разрозненасцю аўтарскіх галасоў. Так, кожнага мастака і яго работы неабходна вывучаць асобна, не разважаючы пра тыя ці іншыя тэндэнцыі, не зважаючы на прыналежнасць да пэўнай кагорты… Але і тут праблема — работ занадта мала для таго, каб рабіць пэўныя высновы. Хоць, відавочна, хтосьці мае прывілеі: напрыклад, Сяргей Гумілеўскі прадставіў некалькі, хоць і невялікіх па памеры, работ. Значную частку экспазіцыі заняла і графіка Фёдара Шурмялёва. Некаторыя ж аўтары прадстаўлены адным, добра калі двума творамі: Васіліна Васілеўская, Мікалай Апіёк, Данііл Граковіч, Ганна Конанава… Магчыма, і не варта наракаць — арганізатары конкурсу спадзяюцца на адукаванасць публікі, на яе пачуццё прыгожага і добры густ.

Між тым напярадзе выбар пераможцаў Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва. Не толькі для журы, але і для гледача самы час зрабіць высновы аб створаным мастакамі: адзначыць найбольш папулярнае, вылучыць фаварытаў, паразважаць пра вартасці і недахопы ў мастацкіх работах апошняга часу. Справа нялёгкая, аднак займальная. Прытым ніякай адказнасці — вось дзе раздолле.

Гэтым разам хацелася б пагаварыць пра работы найменш, так бы мовіць, гучных аўтараў. Іх, што цікава, размясцілі ў аддаленай зале цэнтра на Незалежнасці. Шмат гадоў вельмі плённа працуе ў галіне габелена мастачка Наталля Лісоўская, якая прэзентуе жыццесцвярджальныя творы, напоўненыя спрадвечнымі сімваламі, адметнымі культурнымі кодамі. Вось і яе «Сенажаць» (2021) —



Васіліна Васілеўская «Жар», 2023 г.

увасабленне нязгаснага жыцця. Тут і падобная на стог форма габелена, і асобныя элементы арнаменту з каштоўным зместам. Напрыклад, у верхняй частцы кампазіцыі змешчаны хрысціянскі крыж, а ў цэнтры яго — знак сонца. Гледачам пакінулі падказку: ідэя работы заключаецца ў вечнасці і незваротнасці жыццёвага цыкла.

Ганна Конанава «Віталій Цвірка. Думкі аб Радзіме», 2020—2021 гг.

Звяртае на сябе ўвагу і стракаты дыптых Лізаветы Янковай «Чароўная прастора зямнога жыцця» (2023), складзены з дзвюх розных па памеры частак з назвамі «Жывёлагадоўля» і «Земляробства». Маладая мастачка крышачку па-бунтарску, з ухілам у постмадэрнізм паказвае дзве глабальныя з'явы ў жыцці чалавецтва. У цэнтры абедзвюх кампазіцый, нядзіўна, — чалавек, мужчына, місія якога — імкненне да духоўнага ды інтэлектуальнага самаўдасканалення ў гармоніі з навакольным светам. Усё згодна з боскай задумай. Не ў дакор кажучы, а дзе ж у гэтай канцэпцыі жанчына? Цікава было б паглядзець на падобны эксперымент, здаецца, «Чароўная прастора зямнога жыцця» стала б яшчэ болей дасканалай.

Яўгенія ШЫЦЬКА,
фота аўтара

Адразу ці ніколі

У рамках выстаўкі па выніках Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва праходзяць мерапрыемствы для прыхільнікаў творчасці таго ці іншага аўтара. Фармат апісваецца арганізатарамі як *artist talk* з мастаком: гледачы знаёмяцца з аўтарам, які расказвае пра сябе ў мастацтве і мастацтва ў сабе. Прайшло ўжо некалькі падобных сустрэч, у тым ліку адбылася гутарка з Васілём Васільевым. Мастак і педагог прадставіў праект «Іерусалім. Спёка і холад Вечнага Горада», серыю канцэптуальных жывапісных работ, прысвечаных некаторым падзеям, апісаным у Бібліі.

На выстаўцы ў НЦСМ прадстаўлены карціны «Абмыванне ног», «Нясенне крыжа», «Аплакванне Хрыста. Палажэнне ў труну» і «Хрыстос у труне». Усе створаны ў 2021 годзе.

Работы серыі, між іншым, характарызуюцца хуткім рысункам, адсутнасцю дэталізацыі. Так, каментуючы «Аплакванне Хрыста», Васіль Васільеў заўважыў: «Я заўсёды стараюся захаваць адчуванне пластычнага рашэння. Імкнуся, каб яно не перарасло ў жалезабетонную канструкцыю, каб існавала на грані зрыву, нібыта вось-вось — і ўсё знікне, расплывецца…» Што тычыцца праекта «Іерусалім. Спёка і холад Вечнага Горада», майстар стварыў яго хутка. «Такія работы доўга маляваць нельга, — удакладніў аўтар. — Альбо адразу, альбо ніколі. Бо трэба злавіць момант, калі адважваешся гэта зрабіць, і трымаць рашэнне да канца. А калі пачынаеш выпраўляць, паляпшаць, нешта галоўнае можа згубіцца».

Тэма, якую абраў мастак для асэнсавання, надзвычай складаная. Не кожны, нават неабыякавы да рэлігіі, чуйны да веры, возьмецца за адлюстраванне тых ці іншых сюжэтаў. Ведання Свяшчэннага Пісання, унутранай сілы, упэўненасці і нават майстэрства можа папросту не хапіць для стварэння вартага твора. Неабходна знайсці адметнае рашэнне. Да таго ж колькі ўжо напісана! Васіль Васільеў, распавядаючы пра карціну «Хрыстос у труне», нагадвае і падкрэслівае: «Гэта вельмі распаўсюджаны сюжэт, асабліва ў еўрапейскім мастацтве. Сустракаюцца даволі ўдалыя работы. Самая трагічная выява Хрыста ў труне, на маю думку, належыць Яну Ван Эйку. Вельмі натуралістычны і страшны твор… Пад вялікім уплывам ад яго быў Фёдар Дастаеўскі. Але я не хацеў адлюстроўваць мёртвага, змучанага перад смерцю чалавека, бо такіх выяў зроблена дастаткова. Мяне цікавіла сама сітуацыя: момант, калі цела Хрыста загарнулі ў плашчаніцу і пакінулі. Далей будзе ўваскрэсенне… А пакуль Хрыстос адзін… Для мяне гэта было важней, чым адлюстраванне смерці, калі чалавек становіцца сам на сябе не падобны, калі яго цела пакідае душа. Тут жа іншая справа — мы ведаем, што душа застаецца з Хрыстом, ён уваскрэсне, а той перыяд знаходжання ў труне вельмі кароткі».

«Абмыванне ног», 2021 г.

Васіль Васільеў упэўнены, што ў мастацтве кожны ўчынак патрабуе незвычайнай сітуацыі, мужнасці. Неабходна дзейнічаць, магчыма, неаднаразова памыляцца, і з вопытам прыйдзе тое, што называецца майстэрствам.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Даведка «ЛіМа»

Васіль Вячаслававіч Васільеў нарадзіўся 2 снежня 1954 года ў Оршы. Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, а таксама аддзяленне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай акадэміі мастацтваў. Старшы выкладчык, дацэнт кафедры дызайну Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Удзельнічае ў выстаўках з 1978. Член Беларускага саюза мастакоў (1993). Жыве ў Віцебску. Васіль Васільеў — аўтар і куратар вялікай колькасці самастойных і калектыўных канцэптуальных праектаў. Стварае, апроч іншага, інсталяцыі, кампазіцыі ў галіне «лэнд-арту».

Любоў і чысціня ва ўсіх праявах

У рэпертуары Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі шмат яркіх спектакляў паводле сусветнай опернай класікі. Выдатна: прыгожыя оперы, якія можна слухаць бясконца, — гэта, насамрэч, асаблівасць існавання жанру, бо кожны раз і кожны выканаўца ўносіць у твор новыя фарбы. Хадзі і слухай, як упершыню, шэдэўры Вердзі ці Пучыні. Але ж гэты прынцып справядлівы для ўсіх опер: калі збіраецца шыкоўны склад выканаўцаў, то гэта па ўражаннях усё адно, што паслухаць прэм'еру. А калі выдатныя выканаўцы збіраюцца, каб праспяваць адну з нацыянальных беларускіх опер, якія ёсць у рэпертуары, то гэта цудоўная падстава, каб пайсці і паслухаць яе яшчэ раз, калі раней ужо была магчымасць пазнаёміцца з творам. Альбо нагода дакрануцца да яго ўпершыню. Пашчасціла тым, хто наведаў спектакль «Сівая легенда» ў Вялікім тэатры Беларусі 1 лістапада, і справа не толькі ў тым, што спявалі найлепшыя салісты тэатра. Справа ў тым, што опера кампазітара Дзмітрыя Смольскага паводле Уладзіміра Караткевіча жыве ўжо 45 гадоў. І гэта не проста адна з дат, якія ствараюць нагоду для асаблівага ўшанавання. Гэта пастаноўка, пра якую варта гаварыць, нагадваць і слухаць яе, а яшчэ імкнуцца адказаць сабе на тыя пытанні, што ўзнікаюць пасля. А яны ўзнікаюць кожны раз, нават калі паслухаў гэтую оперу неаднойчы. Чаму ж пры кожным выкананні «Сівой легенлы» ёй столькі ўвагі: тэатр стварае адмысловыя праграмы, каб падкрэсліць гістарычны кантэкст, каб звярнуць увагу, патлумачыць, нагадаць і зацікавіць?.. Што ж асаблівага ў гэтай оперы?

Сцэна са спектакля «Сівая легенда», 1978 год.

1. Аўтар лібрэта

Вядома, гэта самы адметны факт, што тычыцца оперы «Сівая легенда», таму што лібрэта ствараў сам Уладзімір Караткевіч у супрацоўніцтве з кампазітарам Дзмітрыем Смольскім, які да таго часу ўжо заявіў пра сябе ў музыцы як аўтар з асаблівым светаадчуваннем.

І здаецца, яны сышліся ў гэтым, два аўтары-стваральнікі. У той час, калі пачалася праца над операй, абодва былі ўжо адметныя творцы, асобы з уласным разуменнем нацыянальнай гісторыі і культуры. Кампазітар узяўся за літаратурны твор, які да гэтага ўжо жыў сваім жыццём. Аўтар усведамляў: адна справа — літаратура з яе сюжэтным развіццём, і зусім іншая — лібрэта, дзе трэба тэму, сюжэт абазначыць праз карціны і сцэны. Таму, калі прачытаць аповесць і параўнаць адчуванні з праглядам оперы, яны будуць розныя. Гэта ж розныя віды мастацтва, хоць і з аднымі і тым і ж героямі і сюжэтам.

2. Аўтар музыкі

…Дух беларускіх легенд ды паданняў адчуваецца адразу ж з уверцюры — музыка выплывае нібыта з мінуўшчыны і злучае часы, каб тых, хто сядзіць у зале, не проста заглыбіць у дзею, а зрабіць сузіральнікамі

Сцэна са спектакля «Сівая легенда», 2012 год.

падзей, што адбываюцца на сцэне. Ты тут, ты прысутнічаеш, гэта частка твайго свету, прынамсі, на вечар. Напэўна, так было не заўсёды, бо вядома, што для другой рэдакцыі оперы (якая ідзе цяпер) кампазітар перакампанаваў музычны матэрыял. Пры тым, што быў ужо прызнаным майстрам, жывым класікам беларускай музыкі. Але ж, магчыма, працаваў так не дзеля сябе, а дзеля ідэі. Справа ў тым, што «Сівая легенда» — гэта першая опера Дзмітрыя Смольскага, пазней ён яшчэ напісаў «Францыск Скарына» і «Апалон-заканадаўца». Але лёс выбраў менавіта «Сівую легенду» для працягу гучання цудоўнай музыкі выдатнага кампазітара, які быў знакаміты ў асноўным як сімфаніст і стаў класікам беларускай сучаснай музыкі. Але, як ні дзіўна, адчуць яго музычны свет дае магчымасць слухачам менавіта опера, дзе гукі ліюцца нібыта з сэрца радзімы…

3. Мова

Напэўна, Уладзіміру Караткевічу было няпроста адаптаваць літаратурны твор для сцэнічнага ўвасаблення, але ж яго светабачанне і стыль усё ж адчуваюцца, асабліва, калі слухаеш прыгожа-пранікнёныя арыі, якія гучаць па-беларуску. А як іначай, калі героі разважаюць пра вельмі тонкія і інтымныя рэчы: каханне да жанчыны і любоў да радзімы?.. Між іншым, залатая формула поспеху для оперы. Аўтары разумелі, што і дзеля чаго ствараюць.

Дзіва яшчэ і ў тым, што праслухоўванне оперы звычайна вядзе да прачытання аповесці. Адно не адмаўляе другое, а, наадварот, толькі заахвочвае дапытлівага слухача. Па сутнасці, два розныя творы — літаратурны і музычны — пра адно. Але ці так яно было ад пачатку?

4. Дзве ўзнагароды

Оперу «Сівая легенда» ў Вялікім тэатры Беларусі паставілі ў 1978 годзе — той выпадак, калі твор узялі да пастаноўкі адразу пасля заканчэння работы над партытурай. На той час яе ажыццявіў рэжысёр Сямён Штэйн. І яна тады лічылася сучаснай, таму што мела адмысловы падыход да характарыстыкі герояў — станоўчых і адмоўных, што было падкрэслена ў тым ліку з дапамогай музычных сродкаў. Трупа працавала натхнёна, што асабліва радавала кампазітара, які бачыў оперу лірычнай праз тэму кахання Ірыны і Рамана. Але ж не быў бы ў лібрэтыстах сам Караткевіч, калі б не прагучалі матывы, важныя асабіста для яго: пра Беларусь, якая імкнулася сябе адстаяць… Не магло не закрануць: у 1980 годзе опера «Сівая легенда» была адзначана Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь. Але нават адзначаныя творы з часам сыходзяць са сцэны…

Пра «Сівую легенду» згадалі ў XXI стагоддзі: тэатру трэба былі творы нацыянальнага рэпертуару. У 2012 годзе другую пастаноўку оперы ажыццявіў рэжысёр Міхаіл Панджавідзэ. Новае прачытанне, новыя пастановачныя магчымасці, нават новая 2-я рэдакцыя оперы, якую зрабіў сам Дзмітрый Смольскі. Ён вельмі хацеў, каб опера жыла на сцэне — дзеля гэтага ў яе музычнай частцы шмат што змянілася. Кампазітар пайшоў на гэта, разумеючы, што атрымліваецца крыху іншы твор, больш рамантычны, сканцэнтраваны на паводзінах і жарсцях, што паглынаюць галоўных герояў — Рамана і Кізгайлу, Любку ды Ірыну. З акцэнтам на трагедыю двух закаханых, але ж з надзеяй, паказанай пастаноўшчыкамі ў выглядзе вобразаў святых Пятра і Фяўронні ў фінале. Што праўда, гэта выклікала больш пытанняў, але ж зразумела: у тэатры публіка чакае (шукае?) надзеі. Магчыма, гэтыя чаканні і пошукі далі новы штуршок для жыцця оперы «Сівая легенда», якая ў 2012 годзе была адзначана Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь.

5. Моцныя характары

Уся ўвага да твора зразумелая, у ім ёсць усё: шчырае і ахвярнае каханне, жаданне змагацца за яго, сяброўская здрада і бязлітасная рэўнасць, за якой стаіць смерць. І цяжка сказаць, хто з чатырох герояў тут другасны. Сплятаецца складаная інтрыга, калі шляхціц Раман закаханы ў халопку Ірыну, якая належыць яго сябру Кізгайлу. А яго жонка Любка супраць таго, каб адпусціць Ірыну, і саслоўныя абставіны тут ні пры чым… Увага гледача пераключаецца з аднаго героя на іншага, вельмі адметныя дуэты. Але сутнасць і кульмінацыя — арыя Рамана, калі яго раздзіраюць сумненні, але тут выразна гучыць тэма болю за радзіму. Яна ёсць, няхай дзея ўсё ж ідзе ўслед за каханнем — яно ставіцца ў аснову ўсяго, яно перамагае змрок і разбурае смерць. Але стрыжань галоўнага героя ў тым, што ён умее любіць і кахаць.

6. Гістарычнасць

Пасля прэм'еры заставалася шмат пытанняў наконт таго, як дзейнічаюць героі, ці апраўданы іх паводзіны на сцэне. Ці магла б Любка паводзіць сябе так, як мы бачым? Ці дастаткова пераканаўча выбудавана і прадумана сцэна, калі Раман застаецца сам-насам са сваімі думкамі на фоне мультымедыйнай праекцыі? Ці дазваляе сцэнічны антураж адчуць далёкую эпоху — дзеянне адбываецца ў XVII стагоддзі. Але гістарычнасць ствараюць усё ж з дапамогай сучасных сродкаў — стылізаваных касцюмаў, сцэнаграфіі (мастак Аляксандр Касцючэнка). І зноў-такі з дапамогай тэхналогій мультымедыя, што ў сучасным тэатры выкарыстоўваюцца даволі актыўна. І тут мы бачым праекцыі, якія павінны дазволіць адчуць Беларусь (вось толькі далёкую ці сучасную — пытанне, бо сучасную паказаць значна прасцей). Магчымасці нашай сцэны дазваляюць вельмі шмат, што і паказалі стваральнікі спектакля. Галоўнае, каб адно не супярэчыла другому і працавала на агульную ідэю.

7. Галасы

На агульную ідэю працуюць і артысты, у кожнага з якіх свая задача, згодна з канцэптуальным падыходам рэжысёра-пастаноўшчыка. Але якія б ні былі падыходы, у оперы галоўным застаецца голас, і гэта тое, што ў дадзеным выпадку хутчэй за ўсё вызначыць уражанне ад праслухоўвання. Напрыклад, мой уласны досвед стасункаў з «Сівой легендай» палягаў у тым, каб пасля прагляду спектакля аднойчы, слухаць гэтую оперу з заплюшчанымі вачыма: уласнае ўяўленне дапамагала надаць героям дадатковыя афарбоўкі. Але калі на сцэне зорны склад, то, вядома, будзеш глядзець, слухаць і адзначаць самыя яскравыя моманты. Напрыклад, 1 лістапада Ірыну спявала народная артыстка Беларусі Настасся Масквіна, Любку — заслужаная артыстка Беларусі Аксана Якушэвіч, народны артыст Беларусі Уладзімір Громаў увасобіў Кізгайлу. А вось у ролі Рамана ўпершыню можна было пабачыць маладога тэнара Дзмітрыя Шабецю, які звярнуў увагу на прыгожую музыку, моцнае беларускае слова, магутнасць беларускага духу і любоў ды чысціню ва ўсіх праявах. Калі так лічыць моладзь, то опера жыве недарма. Самы час упэўніцца ў гэтым.

Ларыса ЦІМОШЫК

Фота з сайта Вялікага тэатра

Вялікі ў Вялікім

Лістапад — месяц вялікіх сустрэч Вялікіх тэатраў. Адбудуцца яны ў Мінску ў межах абменных гастроляў Вялікага тэатра Беларусі і Вялікага тэатра Расіі. Летась мы паказалі ў Маскве мастацтва сучаснай Беларусі, у прыватнасці оперу Дзмітрыя Солтана «Дзікае паляванне караля Стаха» ў пастаноўцы Ганны Маторнай і «Шчаўкунок» у харэаграфіі Валянціна Елізар'ева. Цяпер прыйшоў час выступіць у адказ. І вось, згодна з дамовай паміж двума генеральнымі дырэктарамі — Вялікага тэатра ў Мінску Кацярыны Дулавай і Вялікага тэатра Масквы Уладзімірам Урыным, — на мінскай сцэне адбудзецца паказ двух спектакляў. І гэта цікава не толькі тым, што традыцыйна Вялікі тэатр Расіі трымае высокі ўзровень майстэрства ў оперы і балеце. Гэта цікава найперш назвамі спектакляў, якія нам прапануюць паглядзець.

Па-першае, адметны выбар тэмы твораў, якія вязуць у Мінск. Гэта опера «Царская нявеста» Мікалая Рымскага-Корсакава. Што дзіўнага, калі гэтая опера ёсць у рэпертуары нашага тэатра, спытаеце вы. Ёсць у нас такая опера, і будзе вельмі цікава параўнаць дзве пастаноўкі. Але глядзець спектакль масквічоў трэба ўсё ж не з-за гэтага. У Вялікім тэатры Масквы «Царская нявеста» ідзе з 1916 года, яна зведала шмат пастановак і застаецца актуальнай, паколькі ёсць цікавасць да адлюстравання ў мастацтве гістарычнай тэмы. А ў оперы дзеянне адбываецца ў часы Івана Грознага. І як ні дзіўна, гэтая ж тэма і той жа час адлюстраваны ў балеце Сяргея Пракоф'ева «Іван Грозны», які рыхтуюцца прадставіць у Мінску.

Такім чынам, оперу М. Рымскага-Корсакава «Царская нявеста» маем магчымасць паслухаць 22 і 23 лістапада. Музычным кіраўніком спектакля стаў Генадзь Раждественскі, а за дырыжорскім пультам будзе Канстанцін Чудоўскі.

25 і 26 лістапада балет С. Пракоф'ева «Іван Грозны» ў пастаноўцы легендарнага харэографа Юрыя Грыгаровіча, які зрабіў акцэнт на супрацьстаянні цара Івана і князя Курбскага. Гэты спектакль быў пастаўлены ў 1975 годзе, адноўлены ў 2012-м. Дырыжыраваць будзе Павел Клінічаў. А ў галоўных партыях пабачым зорак балета Вялікага тэатра Расіі Святлану Захараву, Дзяніса Родзькіна, Міхаіла Лабухіна, Ганну Нікуліну, Арцемія Белякова.

Гэта сапраўдныя абменныя гастролі: у Мінск прыедзе каля 400 чалавек. Папярэдні раз Вялікі тэатр Расіі прывозіў спектаклі ў Беларусь у 2009 годзе на адкрыццё Года культуры Расійскай Федэрацыі ў нашай краіне. Але артысты Вялікага тэатра Масквы час ад часу выступаюць у беларускіх пастаноўках, што дае магчымасць па-іншаму паглядзець на спектаклі, якія ідуць на айчыннай сцэне.

Ларыса ЦІМОШЫК

Што найграла скрыпка Страдывары

Пры кожным згадванні інструмента, зробленага выдатным італьянскім майстрам, віртуозам Антоніа Страдывары, сэрца сапраўдных знаўцаў музыкі ўсхвалявана б'ецца. Усе ведаюць, што ў гэтым майстэрстве яму не было роўных у свеце. Калі ж з'яўляецца новае сведчанне, што захавалася яшчэ адна скрыпка, якой ён даў жыццё, гэта ўспрымаецца сенсацыяй. Часам, праўда, не ўсе вераць у магчымасць такога. Столькі часу прайшло, скрыпкі яго аўтарства даўно на ўліку. Яшчэ больш сумніўцаў, калі згадваецца скрыпка Страдывары, якая некалі існавала, але сталася так, што да нашых дзён не дайшла. Пацвердзіць, наколькі гэта праўда, па сутнасці, немагчыма. Але гледзячы ад каго такое чуеш.

Хто стаў галоўным рэжысёрам

Каму-каму, а заслужанаму артысту Беларусі, лаўрэату многіх высокіх узнагарод, сярод якіх медаль і ордэн Францыска Скарыны, дэкану тэатральнага факультэта Беларускай дзяржанай акадэміі мастацтва Уладзіміру Мішчанчуку нельга не верыць. Уладзімір Андрэевіч — не з тых, хто можа хлусіць. Асабліва калі гаворка тычыцца такога сур'ёзнага факта.

Скрыпка Страдывары, няхай сабе і з расколатай дэкай, у пасляваенны час захоўвалася ў яго дзядзькі Сямёна. У багатай калекцыі былі і іншыя даўнія музычныя інструменты, цаны якім няма: акардэоны, гармонікі, піяніна. Узрост некаторых з іх вымяраўся не гадамі і не дзясяткамі, а стагоддзямі. Праз музыку Уладзімір Андрэевіч і далучаўся да чароўнага свету мастацтва.

Уладзімір Мішчанчук у ролі пана Быкоўскага («Паўлінка» Я. Купалы). Гродзенскі абласны драматычны тэатр.

Нарадзіўся ў драгічынскай вёсцы Валавель. Сям'я была хоць і сялянская, але на іншыя не падобная. Не тым, што вялікая. На Палессі мала каго гэтым здзівіш. У многіх вяскоўцаў дзяцей — як таго гароху пры дарозе. Мішчанчукі вылучаліся іншым. Усе да аднаго яны любілі спяваць.

Старэйшая сястра Валодзі пазней спявала ў царкве на клірасе. Ён таксама да спеваў быў здатны. А яшчэ вабіла яго ўсё тое, што ў аснове сваёй мае сцэнічнае дзейства. Як і спевы — з ранніх гадоў. У адным з інтэрв'ю прызнаўся: «Колькі сябе памятаю — абавязкова нешта пераймаю, разыгрываю і паказваю». Пры гэтым дадае, што «відаць, так было прадвызначана лёсам і тым галоўным рэжысёрам, якім з'яўляецца Гасподзь Бог».

У гасцінную хату яго бацькоў часта завітвала мясцовая моладзь. Разам з гаспадарамі і іх дзецьмі юнакі і дзяўчаты спявалі, весяліліся. У цёплую пару года збіраліся ў двары. Месца ставала, таму і ладзілі штосьці накшталт спектакляў. Валодзя не адставаў ад іншых. Разам з імі што-небудзь разыгрываў. Аднак, па праўдзе кажучы, і аднаму хацелася засведчыць, на што здатны. Неяк падумалася яму: «А чаму б свой тэатр не стварыць?» Малады, энергічны, хутка і «сцэну» знайшоў.

Даўно прыглядаўся да куфра, які стаяў у хаце каля акна. Падумаў-паразважаў і ўпэўніўся, што лепшай сцэнічнай пляцоўкі шукаць не трэба. Размясціўшыся тут, лёгка пераўвасобіцца ў якога хочаш персанажа. З'явіцца жаданне — можна якінебудзь твор прадэкламаваць. Закавыка была ў адным: як быць з глядзельнай залай?

Прасцей, канешне, запрасіць ахвотных у хату. Аднак ці гэта выйсце? А калі іх з'явіцца шмат? Усе не размесцяцца. Падумаў Валодзя і здзівіўся, як да гэтага раней не дадумаўся. У глядзельную залу можна ператварыць двор. Гледачы з надворнага боку размесцяцца бліжэй да акна. Фіранкі на акне стануць заслонай. Перад пачаткам спектакля іх трэба рассунуць, а па заканчэнні — ссунуць. Каб ствараліся ўражанне большай тэатральнай прасторы, куфар лепш адсунуць далей ад акна.



Уладзімір Мішчанчук.

На акцёраў вучаць?

Валодзя Міншчанчук разважаў і дзейнічаў як вопытны рэжысёр. Прадугледзеў і тое, як «артыстаў» лепш пераўвасобіць у будучых персанажаў. Зрабіць так, каб яны выглядалі як мага больш праўдападобна. Канешне, грыму на той час ніколі не бачыў, але чуў пра яго і ведаў, для чаго ён неабходны. Крыху пафантазіраваўшы, хутка знайшоў.

Можна грыміравацца сажай — гэтага дабра колькі заўгодна. Калі захочацца воблік таго, чыя роля будзе выконвацца, выпісаць лепш, больш праўдападобна і пераканаўча, падыдзе вугаль. У што апранаць персанажаў, таксама хутка вызначыўся. Выкарыстаў матчыны строі, бацькаў кажух. Можна надзець і як звычайную апратку, а можна і вывернуць.

З рэпертуарам вызначыўся раней, калі яшчэ толькі збіраўся ладзіць свае спектаклі. Падбіраў тое, што спадабалася ў кнігах, якіх прачытаў нямала. Разумеў, што больш падыдуць казкі. Ніхто з гледачоў не будзе супраць таго, каб убачыць Бабу Ягу, сустрэцца з Кашчэем Неўміручым, з іншымі знаёмымі ім персанажамі. А што на спектаклі будуць хадзіць гэтакія ж, як сам, школьнікі, не сумняваўся.

Хутка ў Валавелі толькі і размоў было пра тэатр Валодзі Мішчанчука. Калі ў чым і памыліўся, дык у тым, што не толькі вучні зацікавіліся ім. Наведвалася і нямала дарослых. Ён так праўдзіва пераўвасабляўся ў сваіх герояў, што ўсё ўспрымалася нібы ў сапраўднасці. Гледачы падбадзёрвалі яго, шчыра апладзіравалі. Калі ж што-небудзь не падабалася, маглі і асвістаць. Адмоўныя ж персанажы выклікалі непрыязь. Аднойчы пачалі кідаць каменьчыкі, адзін з якіх разбіў шыбу.

Бацьку давялося ўстаўляць новую. Хоць і моцна насварыўся на Валодзю, поспехам яго радаваўся. Ахвочы быў сын і да вучобы, у школу пайшоў у шэсць гадоў. Хай сабе не ў ладах з матэматыкай, затое па іншых школьных прадметах вучыўся добра. Між іншым матэматыку выкладаў той самы дзядзька Сямён. Як ні стараўся прывіць пляменніку любоў да яе, нічога не атрымлівалася. Тройкі ставіў, часам і двойкі — сістэма ацэнкі ведаў была пяцібальная. Бацькам паведамляў, каб паўшчувалі. Аднак і яны нічога не маглі зрабіць.

А вось у школьнай мастацкай самадзейнасці яму роўных не было. Нярэдка вучні яго ўжо і не па імені клікалі, а называлі артыстам пагарэлага тэатра. Хто з усмешкай, хто з захапленнем поспехамі, а хто і зласліва, бо былі і зайздроснікі. Яму ж хоць бы што, бо ў гэтым найменні для яго святымі сталі два словы — артыст і тэатр. Адна настаўніца нават параіла яму, каб абавязкова вучыўся на акцёра. А ён, на свой сорам, і не ведаў, што і гэтая прафесія патрабуе навучання.

Праца і яшчэ раз праца

Здавалася б, павінен прыслухацца да гэтай слушнай парады. Аднак, на здзіўленне тых, хто яго ведаў, скончыўшы сяроднюю школу, падаў дакументы ў Гродзенскі медыцынскі інстытут. За кампанію з тымі, з кім разам вучыўся і хто вырашыў звязаць сваё жыццё з медыцынай. Калі даведаўся, што не паступіў, асабліва не засмуціўся, бо ўсё ж разумеў, што гэта не тая прафесія, да якой ляжыць душа. Аднак толькі праз некалькі гадоў канчаткова ўпэўніўся, што іншага шляху ў яго быць не павінна. Падаў дакументы ў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, цяперашнюю Акадэмію мастацтваў.

Трапіў на курс народнай артысткі Расіі Веры Рэдліх. Вучыцца ў яе, вучаніцы знакамітага Канстанціна Станіслаўскага, шчасцем лічылі ўсе студэнты. На ўсё жыццё застаўся ўдзячны Веры Паўлаўне за тое, што адкрыла сакрэты прафесійнага сцэнічнага жыцця. Заўсёды прытрымліваўся (і прытрымліваецца) таго, што Вера Рэдліх сказала ў пачатку сваёй першай лекцыі: «Акцёрская прафесія, дзеткі мае, — гэта праца, праца і яшчэ раз праца». Уладзімір Андрэевіч прызнаецца: «Гэтую фразу я, узорны вучань, запісаў у сшытак па майстэрстве акцёра. Болей у ім я не пісаў нічога. Але менавіта такая мудрая парада зрабілася падмуркам для майго творчага жыцця».

Пасля заканчэння інстытута атрымаў размеркаванне ў Гродна. Быў не толькі акцёрам абласнога драматычнага тэатра. Неўзабаве стаў і яго дырэктарам. Першым акцёрам-дырэктарам у Беларусі і самым маладым дырэктарам ва ўсім Савецкім Саюзе. А тут якраз пачалося будаўніцтва новага, сучаснага будынка тэатра. Адказнасці стала больш. Справіўся паспяхова не толькі дзякуючы вялікім арганізатарскім здольнасцям, але і таму, што словы Веры Паўлаўны «праца, праца і яшчэ раз праца» сталі яго дэвізам не толькі ў творчым жыцці, але і ва ўсім, чым займаўся. Не ў адным Гродне, а і тады, калі пераехаў у Мінск.

Трэнер, які іграе

У Мінску служыў не толькі акцёрам — узначаліў кафедру майстэрства акцёра і рэжысуры Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, потым стаў дэканам тэатральнага факультэта. Спачатку не ўсё было проста. З'ява звычайная: «творчых чужакоў» у сталіцы ніколі з абдымкамі не сустракалі. Не хавае гэтага і Уладзімір Андрэевіч: «Для многіх быў гэтакім Несцеркам з правінцыі». Аднак даказаў, што не багі гаршкі абпальваюць: «Толькі дзякуючы маёй утрапёнасці ўдалося ўтрымацца на плаву». Штосьці знаёмае? Канешне, іншымі словамі прамоўлена, а сэнс той жа, рэдліхаўскі: «Праца, праца і яшчэ раз праца». Не ў апошнюю чаргу — творчая.

Адзін з рэктараў Беларускай акадэміі мастацтваў назваў яго «гуляючым трэнерам». Трэнерам, бо шмат увагі ўдзяляў падрыхтоўцы маладых артыстаў. Многія з іх, самі стаўшы знакамітымі, памятаюць свайго выкладчыка і дэкана. Ёсць і тыя, хто праявіў талент далёка за межамі Беларусі. Адзін з першых вучняў Георгій Іваноў за мяжой стварыў сваю тэатральную студыю. Вячаслаў Барышэнка звязаў лёс з Італіяй. У яго таксама ўласны тэатр. Сам выступае ў ролі рэжысёра, сам утрымлівае трупу.

Уладзімір Андрэевіч сыграў звыш ста роляў у тэатры, кіно, на тэлебачанні, на радыё. Сярод тых, што ўвасоблены і беларускім рэпертуары, — пан Быкоўскі ў «Паўлінцы» і Лявон Зяблік у «Раскіданым гняздзе» Янкі Купалы, Несцерка ў аднайменным спектаклі па п'есе Віталя Вольскага, Жлукта ў «Мілым чалавеку» Кандрата Крапівы, Дзед Цыбулька ў «Таблетцы пад язык» Андрэя Макаёнка, Галоўчык у «Апошнім шансе» Васіля Быкава… Не чужы Уладзіміру Мішчанчуку і замежны рэпертуар. Ён паспяхова асвойвае ролі ў п'есах расійскіх драматургаў.

І вобразы ў кіно яму даручаюць розныя. Для прыкладу, начальнік штаба маёр Самсонаў у фільме вядомага беларускага кінарэжысёра Вячаслава Нікіфарава «На безыменнай вышыні», дырэктар магазіна ювелірных вырабаў мафіёзі Аркадзь Сяроў у расійскім серыяле «Мужчыны не плачуць», віцэ-прэзідэнт буйной нафтавай карпарацыі Канстанцін Клыкаў, таксама ў расійскім серыяле, толькі дэтэктыўным — «Прызванне».

* * *

Хоць Уладзімір Андрэевіч і не стаў скрыпачом, хто ведае, як склаўся б яго творчы лёс, калі б не скрыпка Стадывары, якая, хай сабе і з расколатай дэкай, захоўвалася ў вясковай хаце.

Еўдакім ДРОМІН

Любоў да мастацтва не ведае кампрамісаў

11 лістапада адзначаецца 120-годдзе з дня нараджэння Аляксандра Ільінскага, народнага артыста СССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, аднаго з пачынальнікаў Коласаўскага тэатра.

Калі гартаеш старонкі гісторыі коласаўскага тэатра, занатаваныя ў розных кнігах — манаграфіях, падручніках, газетных артыкулах, калі слухаеш успаміны старэйшын творчага калектыву, першае імя, якое заўсёды прыгадваецца, — Аляксандр Канстанцінавіч Ільінскі. Тыя, хто яго бачыў на сцэне, кантактаваў з ім у жыцці, успамінаюць гэтыя хвіліны з захапленнем. Ён быў кумірам для гледачоў, якія звычайна пыталіся каля касы: «А сёння Ільінскі іграе?» Калі ж не, то некаторыя расчаравана адыходзілі ўбок і спыняліся ў моцным задуменні, разважаючы, а ці варта сёння ісці на спектакль. Ільінскі быў узорам калі не для пераймання, то вернасці, адданасці тэатру, высокага прафесіяналізму для маладых акцёраў. А яшчэ ён быў вельмі сціплым і простым чалавекам. Былыя яго калегі і сёння прызнаюцца, што ні ценю фанабэрыстасці, ніякіх прыкмет зорнай хваробы ён ніколі не меў. Магутны талент у спалучэнні са сціпласцю, мудрасцю і дабрынёй.

Нарадзіўся ён у гарадку Мір Навагрудскага павета Мінскай губерні. Творчы шлях яго, як і многіх знакамітых у далейшым артыстаў, пачынаўся са школьнай самадзейнасці. А пазней — Мінск, які на той час становіцца цэнтрам росквіту беларускай культуры і мастацтва. Тут у першыя гады пасля рэвалюцыі арганізоўваюцца новыя тэатры, студыі, гурткі самых розных кірункаў. У адзін з такіх маладых творчых калектываў пад назвай «Сучасны тэатр» трапляе Шура Ільінскі ў якасці акцёра-пачаткоўца. Неўзабаве ён (разам з братам, у будучыні вядомым драматургам Мікалаем) паступае ў Першае беларускае таварыства драмы і камедыі на чале з Фларыянам Ждановічам. З адкрыццём БДТ-1 (будучага купалаўскага тэатра) пераходзіць туды. Там былі сыграны ўсе маленькія, даступныя яму, былому артысту-аматару, ролі. Ён прыходзіць да высновы аб неабходнасці атрымаць спецыяльную тэатральную адукацыю. І паступае ў 1922 годзе ў Беларускую драматычную студыю ў Маскве. Выкладчыкі тут — вядомыя артысты і рэжысёры Маскоўскага мастацкага тэатра ды іншых сталічных калектываў Валянцін Смышляеў, Соф'я Гіяцынтава, Барыс Афонін і іншыя — імкнуліся зрабіць са

У ролі Несцеркі.

студыйцаў сапраўдных прафесіяналаў. Сярод будучых артыстаў, якія пасяліліся ў вялікім фае кінатэатра «АРС» на Арбаце, вылучаўся чарнявы, лёгкі і гнуткі, нібы гутаперчавы, юнак — Шура Ільінскі. Ён чамусьці аблюбаваў сабе для пражывання білетную касу, што знаходзілася побач з фае. Хлопец жартаўліва казаў: «Жыву я з усімі выгодамі. Сплю, скурчыўшыся ў тры пагібелі, накрываюся дзіравым кажушком, затое магу кожную ноч чытаць да ачмурэння».



Дзеда Талаш («У пушчах Палесся»).

У 1926 годзе група студыйцаў прыязджае ў Віцебск і складае ядро БДТ-2 (так спярша называўся будучы коласаўскі тэатр). Адной з першых роляў

У спектаклі «Шануй бацьку свайго».

Ільінскага быў Чорт з камедыі Францішка Аляхновіча «Чорт і Баба». Яго выкананне рабіла на гледачоў незабыўнае ўражанне. Стары, аблезлы, абшарпаны, задрыпаны, але абаяльны, таварыскі і надзвычай выразны. Мізэрны і разам з тым такі хатні, свойскі, што хацелася пашкадаваць. Ільінскі ачалавечыў яго. Акцёр выдатна раскрыў у гэтай ролі свой самабытны камедыйны талент і паказаў дасканалае ўменне валодаць целам.

У новым тэатры Ільінскі паступова развіваўся і рос як творчая асоба. Спачатку іграў маленькія, эпізадычныя ролі: Пецю Хваткіна ў «Разломе» Б. Лаўранёва, Палітрука ў «Першай коннай» У. Вішнеўскага. Але іграў бліскуча, ствараючы яркія, змястоўныя вобразы. Паступова артысту сталі даваць больш значныя ролі. З вялікім майстэрствам ён сыграў Швандзю ў «Любові Яравой» К. Транёва. Там ён спалучыў камедыйныя элементы з гераічнай накіраванасцю вобраза. Сярод класічных вобразаў таго часу вылучым яго Фігара з «Жаніцьбы Фігара» Ж.-Б. Бамаршэ. Рэжысёру таго спектакля Паўлу Антакольскаму спатрэбіліся пластычнасць акцёра, здольнасць да імправізацыі. Пазней Ільінскі створыць цэлую галерэю класічных вобразаў. Сярод іх — Хлестакоў у «Рэвізоры» М. Гогаля, Расплюеў з «Вяселля Крачынскага» А. Сухава-Кабыліна, Рабінзон з «Беспасажніцы» і Шчасліўцаў у «Лесе» А. Астроўскага. Фатаваты, малады, свавольны, «без цара ў галаве» — такі Хлестакоў Ільінскага. Рабінзон і Шчасліўцаў былі аб'яднаны ў выкананні Аляксандра Канстанцінавіча адной тэмай — «маленькага чалавека». Прыніжаны і зняважаны правінцыяльны акцёр — не штукар-забаўнік у выкананні Ільінскага, а растаптаная тагачасным грамадствам асоба, якая стаіць па той бок закона. У вобразе Расплюева, як пісалі сучаснікі, артыст падымаўся да давыдаўскай трагічнай вышыні ў вытлумачэнні гэтай ролі і разам з тым быў смешны, варты жалю і страшны. Гэта была цэлая гама ўзлётаў і падзенняў чалавечага духу, разбэшчанага золатам і прагнасцю.

Асобнае месца ў вялікім шэрагу яго роляў займае работа над шэкспіраўскімі вобразамі. У «Гамлеце» артыст іграў Палонія і Першага магільшчыка. Палоній — хітры царадворац, прыніжаны паслугач. Грым, паходка, лісіныя манеры і інтанацыі, цынічныя адносіны да чалавечых пачуццяў былі злучаны ў гэтым вобразе. А Першы магільшчык быў прастадушным клоўнам, поўная супрацьлегласць Палонію, увесь зямны і народны.

Ільінскі ўмеў ствараць складаныя чалавечыя характары ў складаных сітуацыях. Такімі былі яго вобразы ў творах беларускай драматургіі. У п'есе Якуба Коласа «Вайна вайне» Аляксандр Канстанцінавіч іграў Дзям'яна Дзяменю, простага салдата з беларускіх сялян. Ні шэры шынель, ні армейская муштра, ні франтавыя нягоды не знішчылі ў ім прыроднага аптымізму, народнага гумару і знаходлівасці. Гэтыя рысы характару простага чалавека былі перададзены Ільінскім з выключнай задушэўнасцю і жыццёвай

У ролі Расплюева («Вяселле Крачынскага»).

пераканаўчасцю. Рэалізм і народнасць Якуба Коласа былі вельмі блізкія артысту, што выявілася ў вобразе дзеда Талаша ў спектаклі «У пушчах Палесся». У газетных рэцэнзіях на гэты спектакль адзначаліся яго патрыятычнасць, глыбокая народнасць і гераічны характар Талаша ў выкананні Ільінскага. Цікавы факт, што Аляксандр Канстанцінавіч прыязджаў на радзіму Талаша, на Палессе, і жыў там нейкі час, вывучаючы і паглыбляючыся ў гэты характар. Але найвялікшай удачай артыста стаў вобраз Несцеркі ў аднайменнай камедыі Віталя Вольскага. Пасля Ільінскага змянілася многа выканаўцаў, але нікому так і не ўдалося перасягнуць, пераўзысці першага выканаўцу абаяльнасцю, мудрасцю і гумарам, закладзенымі артыстам. Яшчэ сёння ў тэатры працуюць майстры, якія бачылі гэтую работу. Па іх сведчанні, гэта быў вельмі цёплы вобраз. Якраз абаяльнасць і цеплыня рабілі яго блізкім, сваім, родным для тысяч гледачоў.

Амаль напрыканцы творчага шляху Аляксандр Ільінскі стварае яшчэ адзін знакавы вобраз (глыбока трагедыйны) — Тэўе-малочніка з інсцэніроўкі аднайменнага рамана Шолам-Алейхема. Гэта было яшчэ задоўга да знакамітай «Памінальнай малітвы» Рыгора Горына. Спектакль коласаўцаў меў як у Віцебску, так і за яго межамі ашаламляльны поспех (тым больш што гэтая тэма ў тыя часы не асабліва ўздымалася). Былая актрыса коласаўскага тэатра Людміла Заграбельная (яна сама іграла ў гэтым спектаклі) сёння ўспамінае, як на гастролях у Бабруйску гледачы (нават на інвалідных калясках) імкнуліся трапіць на спектакль. Не толькі сама глядзельная зала, але і праходы паміж крэсламі былі шчыльна запоўнены людзьмі. Праводзілі Ільінскага і іншых артыстаў доўгімі авацыямі.

У чым жа сакрэт поспеху сапраўды народнага артыста? Напэўна, у тым, што гэта быў самабытны, прыродны, непаўторны талент. Ён да самазабыцця любіў сваю прафесію, аддаваў ёй сябе цалкам. А любоў, як і мастацтва, не ведае кампрамісаў.

Юрый ІВАНОЎСКІ,
літаратурны рэдактар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа

Інсітнае актуальнае

Выстаўка з назвай «Адтуліны-адсюліны», якая пачала сваю работу ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, знаёміць з сучасным беларускім інсітным мастацтвам. У экспазіцыі прадстаўлены работы Юрыя Пяткевіча і Ірыны Князевай.

Інсітнае, ці «наіўнае», мастацтва адносіцца да непрафесійных форм творчасці XX стагоддзя. У Беларусі гэты від дзейнасці стаў самастойным у 1960-я гады і адразу атрымаў шырокае распаўсюджанне. Уплыў на развіццё інсітнага мастацтва мела творчасць Алены Кіш. Яна адзіная з нашай краіны трапіла ў сусветную энцыклапедыю наіўнага мастацтва.

Рысы «наіўнага» мастацтва ёсць у творах Марка Шагала, Пабла Пікаса, Анры Русо... У Беларусі ў такім стылі працуюць сучасныя мастакі Валянцін Губараў, Марта Шматава, Мікалай Тарасюк ды іншыя.

Юрый Пяткевіч — мастак, паэт і пісьменнік, шырока вядомы ў Беларусі і за мяжой. Яго жывапіс быў прадстаўлены

Ірына Князева «Крык (не Мунк)».

Ірына Князева «Калі не страшна».

на розных выстаўках у Маскве, Сочы і Варонежы. Крытыкі і калегі параўноваць творы нашага сучасніка з некаторымі работамі Марка Шагала. На выстаўцы прадстаўлены вядомыя карціны Юрыя Пяткевіча «Навальніца», «У шорах», «Каля мальберта». Мастак часта выкарыстоўвае цёмныя фарбы, якія перадаюць трывожны настрой і самоту быцця, што супадае з экзістэнцыяльным адценнем інсітнага мастацтва, і расстаўляе акцэнты. Гэта можна заўважыць на карціне «Рукі», дзе натоўп працягвае далоні да гледача. У цэнтры — спалоханыя твары людзей, а на першы план выходзяць менавіта рукі, працягнутыя праз краты. Пераважае чырвоны колер, з-за чаго адчуваюцца напружанасць і страх. Такія ж пачуцці ўзнікаюць пры разглядзе карціны «Апакаліпсіс»: Ісус чытае кнігу, побач з ім казляня. Гэтыя дзве фігуры самыя яркія і светлыя. Фонам выступаюць чорна-сінія хмары і птушкі Сірын, якія ў міфалогіі ўвасабляюць цёмныя сілы. Асноўныя колеры твора — жоўты, чырвоны, чорны і зялёны. З часоў сярэднявечча па хрысціянскіх канонах гэтыя колеры ўвасабляюць чалавечыя заганы і пекла ўвогуле. Яшчэ адна работа Юрыя Пяткевіча з рэлігійным падтэкстам — карціна «Архангел Міхаіл», на якой адлюстравана сцэна вайны на нябёсах паміж святым і цмокам.

Астатнія работы Юрыя Пяткевіча на выстаўцы — гэта серыйныя карціны. Сярод іх — сюжэт «Будаўніцтва Вавілонскай вежы» з шасці частак. Кожны твор дапаўняе ці раскрывае іншы, і, каб зразумець сэнс усяго сюжэта, трэба прааналізаваць усе шэсць. Аналіз зацягвае не на адну гадзіну і нагадвае маленькае асабістае даследаванне. З серыйных сюжэтаў таксама — карціны «Гогаль» з дзвюх частак, «Кветкі» з чатырох частак і «Каханне» з дзвюх. Дарэчы, у цэнтры экспазіцыі знаходзіцца арт-кніга мастака «Цырк». Між тым творы Юрыя Пяткевіча прасякнуты жалобай, горычу і трывогай.

Акрамя работ Юрыя Пяткевіча на выстаўцы «Адтуліны-адсюліны» можна ўбачыць творы Ірыны Князевай, якая, дарэчы, і прапанавала арыгінальную беларускую назву выстаўкі. Мастачка і старшы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры вядомая сваімі ілюстрацыямі да выданняў дзіцячай пісьменніцы Таццяны Дашкевіч «Аблокі для Мілы», «Куды бяжыць сабака Мелі?» і «Сталець ніколі не рана, або Адзін дзень з жыцця звычайнага хлопчыка». Акрамя малюнкаў да кніг на выстаўцы прадстаўлены дываны «Добрай раніцы», «Вераснёвая сямейка», «Крык (не Мунк)», а таксама прысвечаныя Язэпу Драздовічу, Васілю Быкаву і Віцебску. Можна заўважыць, што Ірына Князева натхнялася творамі Алены Кіш. Пра гэта сведчыць кніга — маляваны дыван, прысвечаная жыццю і творчасці агульнавядомай мастачкі. Кніга складаецца з 16 палатняных «старонак» і змяшчае яркія народныя сюжэты і прыпеўкі. Творчасць Ірыны Князевай вельмі кантрастуе з карцінамі Юрыя Пяткевіча. Мастачка выкарыстоўвае яркія фарбы, і ўсе яе творы прасякнуты радасцю жыцця, дабром і гумарам.



Юрый Пяткевіч «Цырк».

Лізавета КРУПЯНЬКОВА

зваротная сувязь

Дажджы на кляновай далоні

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя перадачы.

У выхадныя — праект Навума Гальпяровіча «Сучаснікі. Літаратурныя партрэты». У чацвер публіцыстычная перадача Настассі Ермалюк «Свет мастацкага слова» — сустрэча з сучаснымі пісьменнікамі, якія раскрываюць сваю творчую «кухню».

У нядзелю і панядзелак — радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» Навума Гальпяровіча.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з навінкамі выдавецтваў.

У праграме «Літаратурная анталогія» па буднях — старонкі рамана Дафны Дзюмар'е «Рэбэка». У «Радыёбібліятэцы» з панядзелка да пятніцы — «Зялёны лісток на планеце Зямля» Янкі Сіпакова (чытае народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч). Па суботах выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі» з апавяданнямі айчынных і замежных аўтараў.

У праекце «Прачулым радком» гучаць вершы беларускіх пісьменнікаў.

У перадачы «Радыётэатр плюс» (пачатак эфіру ў 21.30) у выхадныя — радыёпастаноўка паводле п'есы Васіля Віткі «Шчасце паэта», прысвечаная жыццю і творчасці Янкі Купалы.

Для юных прыхільнікаў мастацкага вяшчання ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» — казка Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Новыя прыгоды Лісачкі-красуні». Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для самых маленькіх.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

12 лістапада — 200 гадоў з дня нараджэння Паўла Шпілеўскага (1823—1861), беларускага і расійскага этнографа, фальклярыста, драматурга, публіцыста, тэатральнага крытыка.

12 лістапада — 100 гадоў з дня нараджэння Барыса Паўлёнка (1923—2012), беларускага празаіка, кінасцэнарыста, партыйнага і дзяржаўнага дзеяча.

12 лістапада 80-годдзе адзначае Юрый Сохар (1943), беларускі тэатразнаўца.

14 лістапада — 90 гадоў з дня нараджэння Леаніда Пракопчыка (1933—1998), беларускага празаіка, драматурга, кінасцэнарыста.

15 лістапада — 85 гадоў з дня нараджэння Віктара Цітова (1938—2020), беларускага этнографа, гісторыка, педагога.

15 лістапада — 70 гадоў з дня нараджэння Сяргея Шульгі (1953—2020), беларускага кінарэжысёра, акцёра.

15 лістапада — 90 гадоў з дня нараджэння Яўгена Соцікава (1933), беларускі пісьменнік.

16 лістапада — 130 гадоў з дня нараджэння Леаніды Чарняўскай (Гарэцкай) (1893—1976), беларускага празаіка, перакладчыка, педагога.

16 лістапада — 100 гадоў з дня нараджэння Мікалая Крукоўскага (1923—2013), беларускага культуролага, філосафа, лінгвіста.

17 лістапада 85-годдзе святкуе Уладзімір Ласенка (1938), беларускі паэт.

17 лістапада — 70-гадовы юбілей адзначае Вячаслаў Шчэрбін (1953), беларускі мовазнаўца.

18 лістапада — 140 гадоў з дня нараджэння Язэпа (Іосіфа) Лёсіка (1883—1940), беларускага мовазнаўца, педагога, пісьменніка.

18 лістапада — 85 гадоў з дня нараджэння Станіслава Гарачава (1938—1997), беларускага жывапісца.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

15 лістапада — на творчую сустрэчу з паэтэсай Бажэнай Ганушкінай у Архітэктурна-будаўнічым каледжы (вул. З. Бядулі, 9). Пачатак у 18.00.

16 лістапада — у Дом-музей Якуба Коласа (вул. Акадэмічная, 5) на прэзентацыю чытанкі «Верасок». Пачатак у 11.00.

16 лістапада — у кнігарню «Кніжны клуб пісьменнікаў» (вул. Кісялёва, 4) на творчую сустрэчу з Уладзімірам Мазго. Пачатак у 11.30.

16 лістапада — на пасяджэнне клуба творчых жанчын «Спадчына» пры публічнай бібліятэцы № 5 (вул. Казлова, 2). Пачатак у 17.00.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк
09.11.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 658

Друкарня Рэспубліканская ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецт-ва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 2722

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686